

# «МЫ ВЕЛЬМІ ХАЦЕЛІ Б АКТЫВІЗАВАЦЬ НАША СУПРАЦОЎНІЦТВА З ВАШАЙ КРАІНАЙ»

**Добрыя ўспаміны, работа над дарожнай картай і перспектывы супрацоўніцтва ў будучыні — што аб'ядноўвае Беларусь і Эфіопію**

(Стар. 2–3)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
30 ліпеня 2025 г. СЕРАДА № 144 (30532)

# АСНОВА НАШАЙ БУДУЧЫНІ

**У Беларусі мэтанакіравана паляпшаюцца ўмовы для нараджэння дзяцей**

Асноўныя распрацоўкі медыкаў і навуковых супрацоўнікаў РНПЦ «Маці і дзіця» вядуцца ў галіне скрынінгу цяжарных для выяўлення прыроджаных парокаў развіцця. Мяркуецца, што да 2030 года гэта дасць магчымасць выяўляць да 36 спадчынных захворванняў на раннім этапе, а значыць, паспяхова лячыць і мінімізаваць іх наступствы. У хуткім часе ў РНПЦ плануецца адкрыццё новай ангіяграфічнай аперацыйнай, дзе будуць выконвацца розныя аперацыйныя ўмяшанні для жанчын падчас цяжарнасці. Гэта дазволіць знізіць страты крыві пры такіх паталогіях, як прырошчванне плацэнты. У неанаталогіі развіваецца кірунак выкарыстання ствалавых клетак у неданошаных нованароджаных, і такі метад паказвае добрыя вынікі. У акушэрскай практыцы ўкараняюцца новыя метады хірургічнай карэкцыі. Напрыклад, у жанчын пасля кесарава сячэння падчас паўторнай цяжарнасці праводзіцца пластыка рубца, што дапамагае вынасіць і нарадзіць здаровае дзіця.

СТАР. 11



Фота з архіва БелТА.

ЯК ПАДРЫХТАВАНЫ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА ШКОЛЫ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ? 7




УБОРАЧНАЯ-2025

# ЖНІВО З ІНАВАЦЫЯМІ

**Сабраць ураджай без страт дапамагаюць новыя тэхналогіі і распрацоўкі навукоўцаў**

Сёлетні год, нягледзячы на неспрыяльныя кліматычныя ўмовы, абяцае добры ўраджай. У прыватнасці, на палях ужо саспела збожжа, і яго валавы збор сёлета пераўзыдзе мінулагодні паказчык — аграрыі плануюць намалаціць каля 11 мільёнаў тон. Пры гэтым важна, калі ўлічыць дажджлівае надвор'е, сабраць ураджай без страт. Навукоўцы расказалі пра новыя тэхналогіі, якія сёння прыходзяць на дапамогу ў сельскай гаспадарцы — ад новай сучаснай тэхнікі да аградронаў, што апрацоўваюць палеткі.



СТАР. 4–5

**Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!**

ISSN 1990 — 763X

# «МЫ ВЕЛЬМІ ХАЦЕЛІ Б АКТЫВІЗАВАЦЬ З ВАШАЙ

**Добрыя ўспаміны, работа над дарожнай картай і перспектывы супрацоўніцтва ў будучыні — што аб'ядноўвае Беларусь і Эфіопію**

Геаграфія кааперацыі і сяброўства пашыраецца і актыўна развіваецца з краінамі Афрыкі. У аўторак у цэнтры ўвагі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі было ўзаемадзеянне з Эфіопіяй. Перспектывы супрацоўніцтва кіраўнік дзяржавы абмяркоўваў з міністрам замежных спраў гэтай краіны Гедыёнам Тыматэвасам.


Фота БелТА.

«Вы ведаеце, што Эфіопія для нас з'яўляецца адной з найважнейшых дзяржаў ва Усходняй Афрыцы. І яшчэ з савецкіх часоў у нас добрыя ўспаміны і добрыя надзеі на супрацоўніцтва ў будучыні», — прывітаў госця беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што Эфіопія — велізарная краіна з насельніцтвам каля 130 мільёнаў чалавек. «Мы бачым пэўнае месца, сваё месца ў Эфіопіі, каб быць карыснымі для вас», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Эфіопія — член БРІКС. Беларусь блізкая да раўнапраўнага членства ў гэтай арганізацыі, з'яўляецца партнёрам.

> **«Мы вам удзячныя за тое, што вы нямала зрабілі для таго, каб нас прызнаць партнёрамі БРІКС. Таму ўдзячныя вам і спадзяёмся, што вы нас будзеце падтрымліваць і ў будучыні ў гэтай арганізацыі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.**

Прэзідэнт заўважыў, што тавараабарот паміж Беларуссю і Эфіопіяй невялікі, але ён расце. Па яго словах, выкарыстоўваючы ўзаемны інтарэс двух краін, традыцыйныя сувязі, дзяржавы могуць нарасціць тавараабарот. «Мы дамовіліся з вашым Прэм'ер-міністрам, што міністэрствы замежных спраў Эфіопіі і Беларусі выпрацуюць пэўны план, дарожную карту нашага супрацоўніцтва, што мы сёння і робім», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што ўсе дамоўленасці беларускі бок абавязкова выканае.

«Мы гатовыя пастаўляць вам увесь комплекс машынабудаўнічай прадукцыі, неабходнай для Эфіопіі. Мы гатовыя пастаўляць вам увесь комплекс сельскагаспадарчай тэхнікі і абсталявання. Але, акрамя гэтага, мы гатовыя перадаваць вам адпаведныя тэхналогіі і навучаць вашых людзей», — прапанаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў Гедыёна Тыматэваса перадаць цёплыя і добрыя пажаданні Прэзідэнту і Прэм'ер-міністру Эфіопіі. «Ведайце, што вы заўсёды жаданыя госці для нас, таму сардэчна запрашаем у любы час у Беларусь.

## Даслоўна

### «САБРАНАЯ НА ТЭРЫТОРЫІ НАШАЙ КРАІНЫ БЕЛАРУСКАЯ ТЭХНІКА ЗМОЖА ПРАДАВАЦЦА І Ў ІНШЫЯ КРАІНЫ АФРЫКАНСКАГА КАНТЫНЕНТА»



У размове з журналістамі міністр замежных спраў Эфіопіі падкрэсліў, што цяпер, маючы цёплыя і сяброўскія адносіны паміж нашымі краінамі, трэба працаваць над умацаваннем эканамічных сувязяў, супрацоўніцтва ў галіне інвестыцый. «Мы зацікаўлены ў мадэрнізацыі нашага сельскагаспадарчага сектара з дапамогай беларускага абсталявання і тэхналогій. У цяперашні момант у Беларусі навучаюцца сотні людзей з Эфіопіі, многія грамадзяне нашай краіны і раней вучыліся і на тэрыторыі Беларусі, і краін былога Савецкага Саюза. І мы хацелі б развіваць супрацоўніцтва ў сферы навукі і адукацыі», — адзначыў ён.

Гедыён Тыматэвас расказаў, што цяпер адпрацоўваецца пытанне аб стварэнні на тэрыторыі Эфіопіі сумесных прадпрыемстваў па зборцы беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі з выкарыстаннем айчыннага абсталявання і тэхналогій. «Пасля, мы спадзяёмся, сабраная на тэрыторыі нашай краіны беларуская тэхніка зможа прадавацца і ў іншыя краіны Афрыканскага кантынента», — дадаў ён. Міністр адзначыў, што айчынныя машыны ў Эфіопіі карыстаюцца добрай рэпутацыяй. Гэта надзейная, даўгавечная тэхніка, лёгкая ў эксплуатацыі. «Мы спадзяёмся, што супрацоўніцтва беларускіх і эфіопскіх кампаній можа прынесці шмат выгод. Як вядома, у Афрыцы існуе Афрыканскі саюз, і яго штаб-кватэра знаходзіцца ў Адыс-Абебе. Па сутнасці, сталіца нашай краіны з'яўляецца дыпламатычнай сталіцай Афрыканскага кантынента. Паміж краінамі Афрыканскага саюза існуюць пагадненні аб свабодным гандлі. І тавары, тэхніка, якія будуць выраблядца ў Эфіопіі, будуць свабодна, без межаў прадавацца ў іншыя краіны», — канстатаваў Гедыён Тыматэвас.





# НАША СУПРАЦОЎНІЦТВА КРАІНАЙ»

**Мы абсалютна адкрытыя для супрацоўніцтва з вамі па ўсіх кірунках, пачынаючы ад ваенна-прамысловага комплексу і заканчваючы харчовай бяспекай. Мы вельмі хацелі б актывізаваць наша супрацоўніцтва з вашай краінай», — падсумаваў беларускі лідар.**

У сваю чаргу Гедыён Тыматэвас перадаў цёплае прывітанне ад Прэзідэнта і Прэм'ер-міністра Эфіопіі асабіста Аляксандру Лукашэнку і таксама народу Беларусі. «Паміж нашымі краінамі існуюць моцныя культурныя і гістарычныя сувязі. У нас таксама агульны падыход да гістарычных і рэлігійных каштоўнасцяў. Да гэтага часу ў нашай краіне многія людзі маюць вельмі цёплыя ўспаміны пра сваю вучобу ў часы Савецкага Саюза. Гэтыя людзі ў цяперашні час фарміруюць і падтрымліваюць моцныя сувязі паміж нашымі краінамі», — адзначыў ён.

**Даведка**

## НЕ ПРОСТА АДНАЎЛЯЦЬ, А ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ І МАДЭРНІЗАВАЦЬ АДНОСІНЫ

Як паведамляла БелТА, Аляксандр Лукашэнка ў кастрычніку 2024 года на палях саміту БРІКС у Казані сустрэўся з Прэм'ер-міністрам Эфіопіі Абіем Ахмедам Алі. Гаворачы аб развіцці супрацоўніцтва, кіраўнік беларускай дзяржавы тады прапанаваў: «Давайце пачнём з таго, што бліжэй пазнаёмімся адно з адным. Але я прыхільнік хуткіх крокаў. Свет вельмі мяняецца, ён прымушае нас паскарацца. Таму мы гатовыя настолькі хутка рабіць усё, аб чым мы дамовімся, наколькі да гэтага будзеце гатовыя вы самі».

Асаблівую значнасць двухбаковае супрацоўніцтва набывае ў святле таго, што Беларусь зацікаўлена праз Эфіопію атрымаць доступ на рынак Афрыкі і разглядае гэту краіну як вароты на Афрыканскі кантынент. «Таму нам вельмі цікава супрацоўнічаць з вамі. Думаю, што нам трэба не проста аднаўляць, а ўдасканальваць і мадэрнізаваць шляхі нашага супрацоўніцтва. Мы да гэтага гатовыя», — заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы ў Казані.

У сваю чаргу Абій Ахмед Алі выказаў падзяку беларускаму боку за аднаўленне супрацоўніцтва і ўзаемную падтрымку на сусветнай арэне. Ён заявіў, што эфіопскі бок перш за ўсё зацікаўлены ў сумеснай рабоце ў галіне сельскай гаспадаркі і мадэрнізацыі гэтай галіны. Ёсць таксама цікавасць да сумеснай работы ў тэкстыльнай галіне, горназдабыўной прамысловасці, у сферы высокіх тэхналогій і па шэрагу іншых кірункаў.

У красавіку бягучага года Эфіопію з візітам наведаў міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў. Беларуская дэлегацыя правяла серыю перагавораў з ключавымі прадстаўнікамі эфіопскага ўрада і бізнесу. Размова ў тым ліку ішла аб адаптацыі беларускіх тэхналогій пад патрэбы Эфіопіі і мадэрнізацыі вытворчай базы гэтай краіны. Абмяркоўваліся пастаўкі беларускай тэхнікі, стварэнне сумесных прадпрыемстваў і падрыхтоўка кадраў у беларускіх ВНУ.

Што датычыцца сферы АПК, тут асноўны акцэнт зроблены на падрыхтоўцы кадраў для Эфіопіі ў чатырох беларускіх аграрных ВНУ, а таксама на ўкараненні беларускіх тэхналогій механізацыі сельскай гаспадаркі. Эфіопскі бок выказаў зацікаўленасць ва ўстанаўленні доўгатэрміновых партнёрскіх адносін па пастаўках беларускіх угнаенняў.

**Дарэчы**

## БЕЛАРУСЬ І ЭФІОПІЯ ЎЗГАДНІЛІ ГРАФІК ДВУХБАКОВЫХ СУСТРЭЧ

Міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў 29 ліпеня правёў сустрэчу з міністрам замежных спраў Федэратыўнай Дэмакратычнай Рэспублікі Эфіопія Гедыёнам Тыматэвасам, які знаходзіцца ў Беларусі з рабочым візітам. Пра гэта паведамляе БелТА.

У ходзе перагавораў абмеркаваны комплекс беларуска-эфіопскага парадку дня з акцэнтам на практычную рэалізацыю раней дасягнутых дамоўленасцяў на розных узроўнях. Выказана ўзаемная зацікаўленасць у нарошчванні ўзаемнага гандлю і супрацоўніцтва ў сферы харчовай бяспекі, пашырэнні гуманітарных і культурных сувязяў.

Бакі дамовіліся распачаць практычныя крокі па выхадзе на запуск сумесных праектаў у сферах механізацыі аграрнага сектара Эфіопіі з прымяненнем беларускай тэхнікі і тэхналогій, падрыхтоўцы персаналу для яе сэрвіснага абслугоўвання і навучанні спецыялістаў сельскагаспадарчага сектара ў беларускіх установах адукацыі, трансферы тэхналогій у сельскай гаспадарцы і развіцці дагаворна-прававой базы.

Узгоднены графік двухбаковых мерапрыемстваў паміж Беларуссю і Эфіопіяй да канца 2025 года, у тым ліку палітычныя кансультацыі паміж міністэрствамі замежных спраў, стварэнне міжурадавай камісіі, перагаворы па лініі профільных міністэрстваў і дзелавых колаў. Пацверджана імкненне Мінска і Адыс-Абебы да паглыблення палітычнага дыялогу, а таксама далейшага ўзаемадзеяння і ўзаемнай падтрымкі ў рамках ААН, БРІКС і на іншых шматбаковых пляцоўках.

**Валерыя СЦЯЦКО.**






Фатаграфіі носяць ілюстрацыйны характар.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# АДНОЛЬКАВЫ ПАДЫХОД

### Забеспячэнне роўных правоў для грамадзян Беларусі і Расіі ў атрыманні медыцынскай дапамогі. Што прапануецца ўдасканаліць?

Учора ў Маскве на пасяджэнні Камісіі Парламенцкага Сходу па ахове здароўя, у якім прынялі ўдзел старшыня камісіі Валерый Малашка і дэпутат Дзмітрый Шаўцоў, абмеркавалі пытанне рэалізацыі роўных правоў грамадзян Беларусі і Расіі пры атрыманні медыцынскай дапамогі на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы, паведамілі ў прэс-службе Палаты прадстаўнікоў.



Парламентарыям была прадстаўлена інфармацыя аб дзейнасці міністэрстваў па выкананні рашэння Савета Парламенцкага Сходу ад 23 верасня 2024 года «Аб праваздаенні ўзгодненай палітыкі дзяржаў − удзельнікаў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ў галіне аховы здароўя і аб забеспячэнні роўных правоў грамадзян Беларусі і Расіі ў атрыманні медыцынскай дапамогі» і аб ходзе выканання даручэння старшыні Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Вячаслава Валодзіна ад 18 лістапада 2024 года аб праваздаенні аналізу практыкі прымянення заканадаўства ў Расійскай Федэрацыі і заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы аховы здароўя ў дачыненні да грамадзян Рэспублікі Беларусь і грамадзян Расійскай Федэрацыі з улікам іх прававога становішча. Дэпутаты-члены Камісіі Парламенцкага Сходу па ахове здароўя адзначылі, што міністэрствы аховы здароўя і міністэрствы юстыцыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па вышэйзгаданых даручэннях максімальна прапрацавалі аналітычную інфармацыю і статыстычныя даныя, а таксама выканалі параўнальны аналіз і падрыхтавалі праект выніковага рашэння.

У дакументах канстатуецца, што дагаворна-прававая база для рэгулявання пытанняў забеспячэння роўных правоў і правапрымяняльная практыка ў гэтай сферы сфарміраваны ў дастатковым аб'ёме для эфектыўнай абароны інтарэсаў грамадзян дзвюх дзяржаў.

Разам з тым былі выяўлены прабелы. Сярод іх — пытанне аказання медыцынскай дапамогі непаўналетнім, бацькі якіх пастаянна пражываюць і працуюць у Расійскай Федэрацыі і Рэспубліцы Беларусь, і студэнтам дзённай формы навучання абедзвюх краін, а таксама пытанне аказання медыцынскай дапамогі ваеннаслужачым і грамадзянскаму персаналу Узброеных Сіл. Для запаўнення гэтых лакун былі дадзены адпаведныя рэкамендацыі федэральным органам выканаўчай улады Расійскай Федэрацыі і рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання нашай краіны.

Акрамя таго, міністэрствамі быў праведзены аналіз відаў, формаў і ўмоў аказання медыцынскай дапамогі, гарантаванай бясплатна на тэрыторыі кожнай з дзяржаў, магчымасцяў атрымання платных медыцынскіх паслуг, а таксама аб'ёмаў медыцынскай дапамогі, атрыманай грамадзянамі Беларусі, Расіі на тэрыторыях Расійскай Федэрацыі і нашай краіны, адпаведна. Па яго выніках зроблена высновa, што правы грамадзян Беларусі і Расіі ў атрыманні медыцынскай дапамогі з'яўляюцца ў цэлым роўнымі.

ЖНІВО-2025

# «ПАКУЛЬ СКЛАДАНА, АЛЕ АБАВЯЗКОВА

## Даведаліся, якімі тэмпамі ідзе ўборка, на прыкладзе адной з гаспадарак у Лунінецкім

У Беларусі працягваецца самы гарачы сезон для аграрыяў. І, нават нягледзячы на надвор'е, якое сёлета выпрабоўвае працаўнікоў вёскі на трываласць, спецыялісты запэўніваюць: абавязкова будзем з хлебам. Такога меркавання прытрымліваюцца і аграрыі з самай буйной гаспадаркі Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці — ААТ «Сінкевіцкі». У гэтым пераконваемся на свае вочы, прыехаўшы разам з хлебаробамі на адно з бязмежных палёў беларускага Палесся.

### БІТВА ЗА КОЖНЫ КОЛАС

Як вядома, якасць і колькасць ураджаю залежыць ад многіх фактараў. У гэтым адыгрываюць ролю і прафесіяналізм аграрыяў, і своечасовасць агратэхнічных мерапрыемстваў, і, вядома ж, надвор'е. Адносна цёплая зіма, рэзкія перапады тэмператур вясной, то замаразкі, то засуха, то ліўні, якія накрылі нашу краіну сёння... Але, нягледзячы на выклікі, ураджай на палях вырас годны.

Гул камбайнаў, магутныя МАЗы, якія спяшаюцца на загрузку золата беларускіх палёў, і нястомная праца хлебаробаў — такая карціна на палях ААТ «Сінкевіцкі». Але ў дзень нашага прыезду над полем хадзілі цяжкія хмары. Камбайны завіхаліся, як пчолкі, каб паспець зжаць як мага больш збожжа да чарговай залевы...

Бітва ідзе ў прамым сэнсе за кожны колас. У гаспадарцы разумеюць: гэта не проста збор ураджаю, а стратэгічная задача, ад паспяховага выканання якой залежыць, ці будзе хлеб на стале кожнага беларуса. «Літаральна тыдзень таму мы толькі пачалі ўваходзіць у каляіну, у актыўнае жніво. І пакуль работы даюцца вельмі цяжка, — расказвае **аграном Людміла ШКУТ**. — Работу камбайнераў ускладняюць дрэнныя ўмовы надвор'я. Сёння, напрыклад, удалося прыступіць да працы толькі з абеду. Прыехалі ў поле, прайшлі 200 метраў — і дождж. Спыніліся, пачакалі, праз нейкі час толькі запусцілі жняяркі — і зноў жа дождж... І так раз за разам. Мы стараемся як можам, таму што разумеем: ад нашай працы залежыць харчовая бяспека краіны. І сёння ў нашай гаспадарцы ёсць усё неабходнае, каб забяспечыць людзей хлебам».

Усяго ў гаспадарцы працуе восем экіпажаў камбайнераў. «Бяда толькі ў тым, што мы не можам адначасова задзейнічаць усе восем камбайнаў. Усяму віной — сітуацыя, якая складваецца на палях. З-за той самай непагадзі значна павялічваецца нагрузка на камбайны і зернеачышчальна-сушыльныя комплексы гаспадаркі. Нам катэгарычна не хацелася б губляць ураджай ад вільгаці на палях. Таму пытанні дасушвання ў такім выпадку стаяць рубам».



### ВЫЗВАЛЯЦЬ ПАЛІ І РЫХТАВАЦЦА ДА ЧАРГОВАГА СЕЗОНА СЯЎБЫ

Дарэчы, аграрыі гаспадаркі ўжо выбарачна прыступілі да ўборкі збожжавых. «Са 100 гектараў азімага ячменю, на жаль, загінула 25. Захаваныя 75 гектараў мы ўжо цалкам зжалі, — падключаецца да размовы **дырэктар ААТ «Сінкевіцкі» Генадзь НАЗДРЫН**. — Валавы збор маем каля 240 тон пры ўраджайнасці 31,2 цэнтнера з гектара. На такую ўраджайнасць вельмі разлічваем і далей. На ўборку рапсу, праўда, пакуль выйшлі не ўсім складам — не даюць разгарнуцца ўмовы надвор'я».

Нягледзячы на гібель больш як 300 гектараў, сёлета ў гаспадарцы плануюць павялічыць збор збожжа. Летась тут абмалацілі больш за 5 тысяч гектараў. «Уборачная плошча па збожжавай групе складае 2171 гектар. Акрамя гэтага, маем яшчэ 20 гектараў проса, 200 гектараў кукурузы на зерне, а таксама азімы рапс. На жаль, каля 30 % азімага рапсу загінула сёлета з-за непагадзі — да ўборкі ён дарос на 235 гектарах. Агульная ўборачная плошча азімых культур складае больш за 2600 гектараў», — працягвае кіраўнік сельгасарганізацыі, дадаўшы, што сёлета нагрузка на адзін камбайн па ўборцы збожжавых складае крыху больш за 290 гектараў.

Нягледзячы на пэўную гібель плошчаў ад зімовых і вясновых замаразкаў, у тым ліку азімых і яравых збожжавых, хлеб стаіць нядрэнны. «Думаю, што ўзровень мінулага года мы павінны ўзяць у любым выпадку. На жаль, працаваць даводзіцца як атрымаецца: шукаем «форткі» паміж

# ЖНІВО З ІНАВАЦЫЯМІ

### ВАЖКІ КАРАВАЙ

**Дырэктар Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Сяргей КРАЎЦОЎ** адзначыў, што сёлета тэмпературны рэжым садзейнічаў расцягнутаму перыяду вегетацыі і фарміраванню больш высокага ўраджаю. Ураджайнасць расце ва ўсіх абласцях, у сярэднім па рэспубліцы на 7 ц/га. Страт з-за кліматычных умоў пакуль няма. Расліны працягваюць выспяваць. У сувязі з кліматычнымі ўмовамі прымяняюцца новыя тэхналогіі, распрацаваны рэкамендацыі па тэхналагічным доглядзе.

Паводле назіранняў спецыялістаў, раней ніколі не здаралася, каб сельскагаспадарчыя культуры прадоўжылі свой вегетацыйны перыяд на два тыдні, а некаторыя — і на больш працяглы тэрмін. У красавіку — маі адзначаліся анамальныя тэмпературы: ніжэй за кліматычную норму. Чэрвень не цешыў цяплом. На працягу трох месяцаў сума актыўных тэмператур была ў сярэднім на тры-чатыры градусы ніжэйшая ў параўнанні з сярэднімі шматгадовымі данымі. Па гэтай прычыне перыяд вегетацыі расцягнуўся, а тэрміны ўборачнай кампаніі ссунуліся.

Калі летась аграрыі да канца ліпеня завяршылі ўборку азімага ячменю, то сёлета яны яшчэ знаходзяцца на фінішнай прамой. Азімы рапс убраны толькі на 20 % плошчаў, тады як у папярэдняе жніво — на 90 %. Аднак падаўжэнне вегетацыйнага перыяду — гэта павелічэнне ўраджайнасці. Такія культуры, як рапс, зернебабовыя, маюць свае асаблівасці тэхналагічнага догляду. Каб прадухіліць іх растрэскванне і асыпанне, прымяняецца апрацоўка спецыяльнымі прэпаратамі, якія «склейваюць» зерне, дапамагаючы захаваць і павялічыць ураджайнасць.

### СТАЎКА НА АЙЧЫННУЮ ТЭХНІКУ

Сабраць ураджай без страт дапамагае і тэхніка, у тым ліку апошнія распрацоўкі вучоных для ўборкі кармоў і апрацоўкі глебы. Пра іх расказаў **генеральны дырэктар НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі Дзмітрый КОМЛАЧ**. Так, сумесна з заводам «Лідсельмаш» распрацаваны грабеністыя граблі-валкавальнікі з шырынёй захопу 9,5 м. Яны даюць магчымасць атрымліваць якасныя кармы. Канструктыўная асаблівасць абсталявання — мінімальны кантакт працоўнай часткі з паверхняй, каб выключыць траплянне глебы і камянёў. Доследная партыя праходзіць апрабаванне ў сельгасарганізацыях.

Яшчэ адна навінка — стужкавы валкавальнік, які створаны сумесна з «Лідаграпраммашам». Ён прызначаны для ўкладкі скошанай культуры, каб мець магчымасць падняць яе прэс-падборшчыкам або кормаўборачным камбайнам. Вядуцца прыёмачныя выпрабаванні, і ў хуткім часе тэхніка будзе запушчана ў масавую серыйную вытворчасць. Для пасяўной распрацавана лінейка плугоў, у тым ліку для дробнаконтурных участкаў. Іх серыйны выпуск арганізоўваецца на базе Мінскага завода шасцерань.

Сярод апошніх праектаў — платформа з гідраманіпулятарам, якая замяняе тры машыны і дазваляе аператыўна звозіць рулоны саломы з палёў, шматфункцыянальны модульны глебаапрацоўчы агрэгат, які за адзін праход цалкам рыхтуе глебу да сяўбы. Агрэгат праходзіць прыёмачныя выпрабаванні і таксама ў найбліжэйшы час будзе пастаўлены на серыйную вытворчасць.



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# СПРАВІМСЯ!»

**раёне**

дажджамі — і адразу ж пускаем у ход камбайны, — падкрэслівае Генадзь Наздрын. — Як сказаў на нядаўнім селектары кіраўнік дзяржавы: не чакайце, не сушыце хлеб у палях, вы яго не высушыце. Таму ўбіраем збожжа з павышанай вільготнасцю. Што нам застаецца рабіць? Палі трэба вызваляць і рыхтаваць да чарговага сезона сяўбы збожжавых культур і рапсу пад ураджай ужо 2026 года. Таму ўсе справы цяпер сціскаюцца ў адну спружыну настолькі, што выйсця іншага проста няма. Трэба працаваць, шукаць прымальныя для ўборкі палі. Так мы і робім».

## САКРЭТ ДОБРЫХ УРАДЖАЯЎ

Ранні пад'ём, работа да позняга вечара — а як інакш? Адпачываць няма калі, уборачная диктуе свой распарадак дня. Кожны механізатар, які выходзіць у поле, усведамляе асабістую адказнасць за вынік. На размовы, як і на хобі, часу ў аграрыяў цяпер няма. Пакуль надвор'е спрыяе, яны выкарыстоўваюць кожную хвіліну. Кожны колас, кожная тона — на вагу золата. У гэтай барацьбе за ўраджай работнікі ААТ «Сінкевічкі» паказваюць прыклад сапраўднай самааддачы і прафесіяналізму. Ды і хто лепей раскажа пра ўборку, калі не сам аграрый, які штодзень выходзіць у поле? Так, **трактарыста-машыніста Мікалая РУДЗЬКО** мы і заспелі якраз за ўборкай рапсу. «Пакуль складана, — адзначае ён, — але мы абавязкова справімся, нягледзячы на тое, што надвор'е, вядома, уносіць свае карэктывы. У цэлым, працаваць вельмі падабаецца. Я люблю ўбіраць хлеб. Заўсёды прыемна глядзець, як колас за коласам, шырокай хваляй, заходзіць у жняярку, бункер паступова напаўняецца, а потым зерне забірае машына. І разумееш, што ты таксама ўносіш сваю лепту ў наш агульны каравай».

Сакрэт добрых ураджаяў, па словах Мікалая, просты: «Трэба любіць сваю справу. Тады і ўборачная будзе праходзіць паспяхова. А яшчэ, што важна, мы працуем на айчыннай тэхніцы, і яна нас не падводзіць. Вельмі спадзяюся пабіць свае мінулыя рэкорды. Ды і ў цэлым будучыню звязваю толькі з полем: дзе нарадзіўся, там і спатрэбіўся. Бо, хто б што ні казаў, зарплата ў аграрыяў годная. Заўсёды душа радуецца, калі прыходжу ў краму, купляю хлеб і разумею: я датычны да яго вытворчасці».

Напярэдадні ў хлебаробаў яшчэ шмат працы. Аб выніках пакуль гаварыць рана. Але, гледзячы на тое, як гараць вочы хлебаробаў, як зладжана рухаецца тэхніка па бязмежных палескіх палях, можна з упэўненасцю сказаць: будзем з хлебам!

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ,**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**
*Лунінецкі раён.*

# ТРОЙЧЫ ТЫСЯЧНІКІ!

**Камбайнер і вадзіцель з Клецкага раёна першыя ў краіне пераадолелі мяжу ў тры тысячы тон збожжа**

Камбайнер Павел Шуціла і вадзіцель аўтамабіля «МАЗ» Андрэй Аляксейчык з ААТ «Кухчыцы» Клецкага раёна ўжо былі героямі сёлетняга жніва і нашай публікацыі — яны першыя ў краіне намалацілі і перавезлі тысячу тон збожжа. Аднак тэмпы хлебаробы не зніжаюць і ідуць на новыя рэкорды: першыя ў краіне намалацілі і пераадолелі значную мяжу ў перавозцы збожжа — тры тысячы тон!



Дасягненне хлебаробаў з ААТ «Кухчыцы» — гэта вынік зладжанай работы ўсяго калектыву сельгаспрадпрыемства, выкарыстання сучаснай тэхнікі і прымянення перадавых агратэхналогій. Важную ролю адыгралі і добрыя ўмовы надвор'я, якія спрыялі высокаму ўраджаю збожжавых. З высокімі вынікамі хлебаробаў павіншаваў **старшыня Клецкага райвыканкама Юрый КАРЛОВІЧ**.

«Працоўны подзвіг Паўла Шуцілы і Андрэя Аляксейчыка — гэта не толькі асабістае дасягненне, але і заслуга ўсяго калектыву гаспадаркі. Зладжаная праца механізатараў, аграномаў і іншых спецыялістаў дазволіла дамагчыся такіх высокіх вынікаў, — адзначыў Юрый Карловіч. Віншуючы героя жніва, ён падкрэсліў, што Клецкі раён заўсёды славіцца аграрыямі і ўносіць значны ўклад у агульны каравай Беларусі. А такія людзі, як Павел і Андрэй, з'яўляюцца гонарам краіны і прыкладам для пераймання.

Тры тысячы тон збожжа — гэта не проста сухая справаздача, а сведчанне ўпартай працы, высокага прафесіяналізму і любові да роднай зямлі. За рулём айчыннага камбайна і «МАЗа» мужчыны працуюць увесь час, калі дазваляе надвор'е. Спякота, пыл, кароткія перадышкі — нішто не можа зламаць іх імкненне ўнесці свой уклад у агульны ўраджай. Хлебаробы прызнаюцца, што сакрэт поспеху просты — любіць сваю працу, паважаць тэхніку і не баяцца цяжкасцяў.

У гаспадарцы, ды і ў раёне ў цэлым, гэтых людзей ведаюць і паважаюць. Іх вопыт і майстэрства цэняцца, а самі яны служаць прыкладам для пераймання. Кіраўніцтва гаспадаркі адзначае іх адказны падыход да справы, пунктуальнасць і ўменне знаходзіць выйсце з любой сітуацыі. А героі жніва толькі сціпла ўсміхаюцца і рыхтуюцца да новых працоўных подзвігаў, бо жніво-2025 працягваецца.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота sb.by**





Таксама вучоныя падрыхтавалі рэкамендацыі аграрыям па правядзенні ўборачнай кампаніі, рацыянальным выкарыстанні тэхнікі ў сёлетніх кліматычных умовах. Асаблівая ўвага — на меры, якія даюць магчымасць мінімізаваць страты збожжа. У адпаведнасці з дзеючымі нарматыўнымі патрабаваннямі, дапушчальны ўзровень страт на збожжаўборачным камбайне павінен складаць не больш як 0,5 % пры ўборцы прамога сцябластою, а ў выпадку палеглага збожжа — не больш як 1,5 %. Быў прааналізаваны парк збожжаўборачных камбайнаў, якія прымяняюцца ў краіне. Сёлета на палях іх будзе працаваць 7,6 тысячы адзінак. У тым ліку 86 % — вытворчасці «Гомсельмаша». Доля айчыннай тэхнікі расце.

## БЕСПІЛОТНІКІ Ў ДАПАМОГУ

Працуюць у Беларусі і над укараненнем аградронаў у сельскай гаспадарцы ў прамысловых маштабах. Такія тэхналогіі ўжо знайшлі сваё прымяненне і актыўна развіваюцца яшчэ з 2021 года. Быў створаны першы беспілотны аградрон беларускай вытворчасці.

Апрацоўка раслін з дапамогай такіх тэхналогій мае шэраг пераваг. Сярод іх — выключэнне механічных пашкоджанняў глебы і раслін, значна ніжэйшы сабекошт апрацоўкі, мінімальны кантакт чалавека з прэпаратамі, магчымасць работы на моцна ўвільготненых глебах, у тым ліку ў начны час, на складаных участках палёў.

— Мы пацвярджаем эксперыментальна на палях, а не толькі ў тэарэтычных разліках, што гэта эфектыўна, мэтазгодна і магчыма. Цяпер з удзелам прадпрыемстваў Нацыянальнай акадэміі навук вядзецца работа па інтэграцыі і комплексным укараненні такіх тэхналогій ужо ў прамысловых маштабах. Гэта работа па стварэнні нацыянальнага аператара, які б прымяняў аградроны і ўсё, што звязана з лятальнымі апаратамі, у першую чаргу ў інтарэсах сельскай гаспадаркі, — расказаў **генеральны дырэктар кітайска-беларускага сумеснага прадпрыемства ЗАТ «Авіяцыйныя тэхналогіі і комплексы» Юрый ЛЕАНАВЕЦ**.

Акрамя праграмы па стварэнні аградронаў, ужо больш як 10 гадоў у краіне развіваюцца тэхналогіі з прымяненнем беспілотнікаў, звязаныя з распрацоўкай электронных карт палёў, інвентарызацыяй сельгасугоддзяў, ацэнкай аб'ёмаў работ, усходжасці, прагназаваннем ураджайнасці. Праводзіцца аэрафотаздымка, атрымання даныя пасля апрацоўваюцца.

**Алена КРАВЕЦ.**

# САЮЗ НОВЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

## Мінск рыхтуецца прыняць «ІНАПРАМ. Беларусь»

З 29 верасня да 1 кастрычніка 2025 года ў сталіцы ўпершыню пройдзе Міжнародная прамысловая выстава «ІНАПРАМ. Беларусь». Ужо цяпер мерапрыемства выклікае велізарны ажыятаж з боку бізнесу: забраніравана больш за 70 % выставачных плошчаў, паведамілі арганізатары.

БОЛЬШАЯ ПРОМЫШЛЕННАЯ НЕДЕЛЯ БЕЛАРУСЬ
ИННОПРОМ

Дарэчы, у агульнай складанасці экспазіцыя беларускіх і расійскіх арганізацый зойме больш за 15 тысяч «квадратаў».

Выстава, якая арганізуецца пры падтрымцы профільных міністэрстваў Беларусі і Расіі, стане ключавой падзеяй прамысловага супрацоўніцтва ў рамках Саюзнай дзяржавы і ўсяго Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС).

У мерапрыемстве актыўна ўдзельнічае як беларускі, так і расійскі бізнес.

З боку Беларусі разам з рэгіянальнымі стэндамі плануюць узяць удзел вядучыя нацыянальныя прадпрыемствы: у іх лік уваходзяць МАЗ, «Атлант», «Інтэграл», «Белкамунмаш» і іншыя.

Сярод буйных расійскіх удзельнікаў — 1С, PalipPlast, «Нацпраектбуд», «Расатам». Пры гэтым чакаецца вялікая колькасць калектыўных рэгіянальных экспазіцый: стэнды ўжо пацвердзілі такія рэгіёны, як Масква, Татарстан, Башкартастан, Разанская вобласць, Санкт-Пецярбург, Новасібірская, Тульская, Кіраўская, Валагодская, Чэлябінская вобласці і іншыя.

Дзелавая праграма «ІНАПРАМ. Беларусь» таксама абяцае стаць адным з ключавых элементаў мерапрыемства. У форумнай часткі запланаваны шэраг стратэгічна важных сесій, накіраваных на ўмацаванне прамысловай інтэграцыі ў рамках ЕАЭС і развіццё тэхналагічнага супрацоўніцтва.

Як адзначылі арганізатары, ключавым мерапрыемствам форумнай часткі стане галоўная пленарная сесія «Саюз новых тэхналогій: ствараючы прамысловасць будучыні», прысвечаная прамысловаму супрацоўніцтву Беларусі і Расіі, а таксама кааперацыі кампаній для дасягнення агульных тэхналагічных мэт. Чакаецца, што ў сесіі паўдзельнічаюць Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Аляксандр Турчын і Старшыня Урада Расійскай Федэрацыі Міхаіл Мішусцін.

Акрамя гэтага, будуць праведзены мерапрыемствы, прысвечаныя перспектывам прамысловага супрацоўніцтва ў еўразійскай прасторы, аўтаматызацыі вытворчасці і прамысловым IT, выкарыстання беспілотных авіяцыйных сістэм, міжрэгіянальнаму гандлёва-прамысловаму дыялогу, сучасным рашэнням у сферы транспартнай інфраструктуры, сумесным магчымасцям развіцця аўтамабільнай прамысловасці і іншым стратэгічна важным для абедзвюх дзяржаў тэмам.

Дарэчы, варта нагадаць, што «ІНАПРАМ. Беларусь» — гэта не толькі платформа для дэманстрацыі перадавых тэхналогій і прамысловай прадукцыі, але і прастора для заключэння пагадненняў і абмеркавання будучыні еўразійскай прамысловасці.

# МАРШРУТ ПАБУДАВАНЫ

## Даведаліся, колькі таксі аказваюць паслугі па перавозцы пасажыраў

Памятаеце, у лістападзе мінулага года з увядзеннем новых правілаў па перавозцы пасажыраў колькасць даступных да выкліку машын стала меншай, а тарыфы на паслугі таксі падраслі? Усё гэта было звязана з неабходнасцю ўключэння звестак аб перавозчыках, кіроўцах і іх машынах у рэестр аўтамабільных перавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах. Як ідуць справы на сёння, расказалі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый.




У прыватнасці, па стане на 28 ліпеня бягучага года ў адпаведным рэестры лічацца 5,5 тысячы перавозчыкаў аўтамабілямі-таксі, 37 тысяч кіроўцаў і больш за 26 тысяч аўтамабіляў-таксі.

У Мінтрансе нагадалі, што ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 32 ад 25 студзеня 2024 года з'яўляецца незаконнай і забараняецца транспартная дзейнасць у сферы перавозак пасажыраў у нерэгулярных зносінах, у тым ліку аўтамабілямі-таксі, без уключэння ў рэестр звестак аб транспартных сродках (аўтобусах, легкавых аўто, аўтамабілях-таксі), кіроўцах і дыспетчарах.

З 1 лістапада 2024 года па выніках кантрольных мерапрыемстваў транспартнай інспекцыяй канфіскавана 307 легкавых аўтамабіляў, якія выкарыстоўваліся пры перавозках пасажыраў у сферы таксі без уключэння звестак аб гэтых аўто ў рэестр.

У профільным міністэрстве звярнулі ўвагу, што дыспетчар таксі мае права перадаваць заказы на перавозку пасажыраў аўтамабілямі-таксі толькі перавозчыкам, звесткі аб якіх (у тым ліку кіроўцах і аўтамабілях) уключаныя ў рэестр.

# ПЕНСІЁННЫЯ НАВАЦЫІ

## У Мінпрацы і сацабароны патлумачылі, як працуе спрошчаны механізм прызначэння пенсіі

З гэтага года заяву можна падаваць за месяц да дня нараджэння або на працягу месяца пасля, расказалі ў профільным міністэрстве.




Дарэчы, раней аформіць пенсію трэба было ў органе па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў свой дзень нараджэння: жанчынам — у 58 гадоў, мужчынам — у 63 гады, то-бок у момант наступлення агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту.

Спрошчаны парадак назначэння пенсій датычыцца толькі выплат па ўзросце — не па інваліднасці і з нагоды страты карміцеля. Па выплату па інваліднасці варта звяртацца на працягу трох месяцаў з дня ўстанаўлення групы інваліднасці, а па пенсію з нагоды страты карміцеля — на працягу 12 месяцаў з дня смерці карміцеля.

Хто павінен займацца зборам дакументаў?

Работадаўца абавязаны своечасова прадастаўляць дакументы для прызначэння пенсіі ў дачыненні да сваіх работнікаў. Ён нясе за гэта адказнасць. Яго задача — высветліць, ці ёсць неабходнасць запытваць даведкі аб заробку за перыяд працы да 1 студзеня 2003 года, калі ў краіне не вёўся персаніфікаваны электронны ўлік звестак аб работніках, а таксама праверыць карэктнасць унясення запісаў у працоўнай кніжцы і разабрацца, ці хапае даных аб стажы.

Калі па нейкіх прычынах чалавек не працаваў да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту, тады яму давядзецца самастойна займацца зборам і перадачай усіх дакументаў. Першы крок — звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацабароне па месцы жыхарства, дзе раскажуць, што неабходна зрабіць у залежнасці ад асаблівасцяў працоўнай біяграфіі.

# АДЛЕГЛАСЦЬ ДРУЖБЕ НЕ ПЕРАШКОДА

## Днямі ў індустрыяльным парку «Вялікі камень» адбылося пасяджэнне рабочай групы па супрацоўніцтве Беларусі і Якуціі



Мерапрыемства прайшло пад кіраўніцтвам міністра эканомікі Беларусі Юрыя Чабатара і пастаяннага прадстаўніка пры Прэзідэнце Расійскай Федэрацыі — першага намесніка Старшыні Урада Рэспублікі Саха (Якуція) Андрэя Фядотава, паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі.

У пасяджэнні ўзялі ўдзел прадстаўнікі дзяржорганаў і арганізацый, бізнес-колаў.

Юрый Чабатар адзначыў, што супрацоўніцтва Беларусі і Якуціі выходзіць на якасна новы ўзровень.

— Адным з крокаў у гэтым кірунку стане адкрыццё філіяла «Чыгункі Якуціі» ў Беларусі, што дазволіць знізіць лагістычныя выдаткі і пашырыць таварныя патокі, — выказаў упэўненасць профільны міністр.

Паводле яго слоў, з 2024 года паспяхова функцыянуюць кааперацыйныя біржы і бізнес-масты, арганізаваныя Нацыянальным агенцтвам інвестыцый і прыватызацыі і Беларускім фондам фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў:

— Яны з'яўляюцца эфектыўным інструментам для пошуку новых партнёраў і развіцця малых і сярэдніх прадпрыемстваў.

Не засталася без увагі і выстава беларускіх тавараў у Нярунгры, якая прайшла ў сакавіку гэтага года, пацвердзіўшы высокую цікавасць да нашай прадукцыі.

— І задача стаіць — пастаўляць яе напрост, абыходзячы пасрэднікаў, — падкрэсліў спікер.

У якасці асноўных кірункаў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва на бліжэйшую перспектыву Юрый Чабатар пазначыў пашырэнне наменклатуры ўзаемных паставак, паглыбленне прамысловай кааперацыі і нарошчванне інвестыцый:

— Мы прапануем павялічыць паставакі трактароў МТЗ, пагрузчыкаў Амкадор, БЕЛАЗаў, а таксама іншых тэхнікі і абсталявання.

Ён адзначыў той факт, што Беларусь добра вядомая на расійскім рынку сваімі якаснымі прадуктамі харчавання, і выказаў гатоўнасць нашай краіны нарошчваць пастаўкі спажывецкіх тавараў у Якуцію.

— Ёсць патэнцыял для павелічэння экспарту кабельнай прадукцыі і абсталявання для мадэрнізацыі электраэнергетычнай сістэмы рэгіёна. Мы таксама зацікаўлены ў развіцці прамысловай кааперацыі і нарошчванні ўзаемных інвестыцый, — падкрэсліў міністр эканомікі.

Падчас пасяджэння якуцкім калегам былі прэзентаваныя інвестыцыйныя магчымасці Беларусі.

Завяршылася мерапрыемства падпісаннем пратакола пасяджэння рабочай групы. Пагадненне аб устанаўленні дружалюбных адносін паміж гарадской акругай «горад Якуцк» і Савецкім раёнам горада Мінска, а таксама пагадненне паміж рэзідэнтам індустрыяльнага парка «Вялікі камень», ТАА «Медыцынскія тэхналогіі Бел-Цзінхэ» і аўтаномнай некамерцыйнай арганізацыяй «Цэнтр кіравання праектамі НАЦ «Поўнач».

Мясцовае Самакіраванне
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
30 ліпеня 2025 г. № 27 (808)

НА КАНТРОЛІ

# НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ — БЯСПЕКА

**Карэспандэнт «МС» пацікавілася, як у Магілёўскім рэгіёне дэпутаты маніторацць ход падрыхтоўкі школ да новага навучальнага сезона**




Утульныя тэрыторыі, абноўленыя класы, бяспечныя спартыўныя залы, сучасныя харчаблокі — кожная школа да 1 верасня павінна набыць стан, які адпавядае ўсім патрабаванням якасці і надзейнасці. Адказнасць за гатоўнасць устаноў да новага навучальнага сезона нясуць як мясцовыя органы ўлады, так і дэпутаты. Народныя выбраннікі сёння адсочваюць ход рамонтных работ, дапамагаюць вырашаць складаныя пытанні. Карэспандэнт «МС» пацікавілася, на што яны звяртаюць увагу і якім чынам вырашаюць праблемы.

***

Па словах **старшыні Бабруйскага гарсавета дэпутатаў Ірыны РЫНЕЙСКАЙ,** падрыхтоўка ўстаноў адукацыі Бабруйска да новага навучальнага года выйшла ўжо на фінішную прамую.

Сёлета на капітальныя і бягучыя рамонты, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы школ і дзіцячых садкоў з бюджэту горада выдзелена больш чым 12,8 мільёна рублёў. Акцэнт робіцца на выкананне санітарна-эпідэміялагічных параметраў і стварэнне ўмоў па бяспецы. У дзвюх школах завяршаецца капітальны рамонт, яшчэ ў шасці зроблены рамонт дахаў.


Фота з сайта bobruisk.gov.by

У дзіцячых садках шмат увагі ўдзяляецца добраўпарадкаванню тэрыторый, абнаўленню дваровага абсталявання, падрыхтоўцы вучэбных кабінетаў і дашкольных груп. У работах задзейнічаны ў тым ліку і школьнікі, якія працуюць на ўмовах часовай занятасці на азеляненні школьных тэрыторый, рамонце мэблі. Бабруйскія дэпутаты планамерна і сістэмна адсочваюць ход падрыхтоўкі ўстаноў адукацыі да навучальнага сезона.

— У першую чаргу ацэньваем, як абнаўляюцца класы і іншыя памяшканні, — адзначае Ірына Рынейская. — Цікавімся, ці ёсць праблемы з забеспячэннем усім неабходным класных аўдыторый, спартыўных залаў і пляцовак, ацэньваем, наколькі функцыянальнымі і тэхналагічнымі сталі школьныя харчаблокі. Для нас таксама не менш важна ведаць, якую сумесную работу праводзяць установы адукацыі са сваімі шэфамі, наколькі цесна яны ўзаемадзейнічаюць на карысць дасягнення агульнай мэты.

***

Для **намесніка старшыні Бялыніцкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Святланы ПАТАПЧЫК** тэма падрыхтоўкі школ да новага навучальнага года важная як для спецыяліста, які адказвае за гэту сферу, і як для дэпутата райсавета.

У Бялыніцкім раёне восем школ, дзве з якіх — гарадскія. Усяго ўстановы адукацыі тут наведвае больш чым 2000 дзяцей.

— Да 1 жніўня павінна завяршыцца рэканструкцыя Галоўчынскай школы, і мы кантралюем гэты працэс, — кажа Святлана Патапчык. — Зроблена рэканструкцыя харчаблока, даху, праведзена ўцяпленне сцен. Лічы, новая школа атрымалася, вельмі прыгожая і ўтульная. У ёй будзе вучыцца больш чым 80 хлопчыкаў і дзяўчынак. Работы яшчэ не скончаны, на 28 ліпеня гатоўнасць ацэньвалася ў 98 %.

Сёлета ў першыя класы ў Бялыніцкім раёне прыйдзе каля 200 дзяцей. Школы збіраюцца прыняць сваіх новых выхаванцаў урачыста і гасцінна.

— Штогод установы адукацыі рыхтуюцца да таго, каб час знаходжання ў іх навучэнцаў прайшоў бяспечна і з карысцю, — кажа суразмоўніца. — Над гэтым працуюць і раённыя ўлады, і школы, і арганізацыі (санэпідэмстанцыя, ратавальнікі і ДАІ), і шэфы навучальных устаноў, і дэпутаты. Народныя выбраннікі маніторацць выкананне тых ці іншых даручэнняў камісій. Педагогі — малайцы, своечасова выпраўляюць недахопы. Напрыклад, на сёння па ўсіх школах ліквідаваны заўвагі ратавальнікаў, амаль цалкам выкананыя патрабаванні санэпідэмслужбы. Да 1 жніўня школы абяцаюць нанесці неабходныя разметкі, якія ім прадпісала зрабіць ДАІ. Не сумняваюся, што да новага навучальнага года ўсе ўмовы па бяспецы будуць выкананы.

Дарэчы, у камісіі для ацэнкі гатоўнасці школ да новага навучальнага года Святлана Патапчык задзейнічана як дэпутат.

— Узровень падрыхтоўкі школ да новага навучальнага сезона будзе разгледжаны на пасяджэнні райсавета, — удакладняе яна. — Пытанне сур'ёзнае, і дэпутаты вельмі адказна ставяцца да кантролю ўстаноў адукацыі. Яны адсочваюць, каб класныя аўдыторыі былі максімальна камфортныя для навучання, цікавяцца, наколькі там якаснае асвятленне, ці зручна расстаўлены парты, ці адпавядаюць патрабаванням умовы бяспекі ў фае, задаюць пытанні наконт трывожнай кнопкі. Бачна, што работа праводзіцца не дзеля «птушачкі».

***

**Старшыня Магілёўскага абласавета Аляксандр ГАРОШКІН** рэзюмуе, што сёння дэпутаты нароўні з архіважнай задачай па маніторынгу ходу ўборачнай, якая па патрабаванні Прэзідэнта павінна прайсці вельмі якасна і без страт, засяроджаны і на ходзе падрыхтоўкі школ да новага навучальнага сезона. Гэта таксама задача № 1.

— Зусім хутка дзеці сядуць за парты, і неабходна да гэтага дня зрабіць усё, каб навучанне праходзіла для нашых дзяцей бяспечна і пазітыўна, — падкрэсліў ён. — Ужо праз некалькі тыдняў трэба будзе падпісваць пашпарты гатоўнасці школ да будучага навучальнага года, і дэпутаты трымаюць на кантролі стан тых работ, якія сёння праводзяцца ў школах. Трэба, каб яны былі завершаны своечасова і без праблем. Сумеснымі намаганнямі выканаўчай улады і дэпутацкага корпуса, а таксама бацькоў, якія актыўна далучаюцца да працэсу, мы робім усё для таго, каб 1 верасня дзеці змаглі прыйсці радасныя і прыбраныя ў абноўленыя класы, і нічога ім не сапсавала настрой.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ТЫМ ЧАСАМ

Падрыхтоўку да новага навучальнага года разгледзелі днямі на апаратнай нарадзе пад кіраўніцтвам **старшыні Гомельскага аблвыканкама Івана КРУПКО.**

На нарадзе было агучана, што рамонтныя работы працягваюцца, цяпер яны ў актыўнай фазе. У цэлым, як далажылі старшыні аблвыканкама, узровень гатоўнасці ацэньваецца на 80 працэнтаў. «Праведзены дзяржзакупкі, заключаны дагаворы на пастаўку абсталявання. Сумненняў у атрыманні ўсімі аб'ектамі пашпартоў гатоўнасці да патрэбнага тэрміну няма. Парк школьных аўтобусаў папоўніцца 29 адзінкамі. Закрыты пытанні і па кадравым забеспячэнні: сёлета ў сістэму адукацыі прыйдуць працаваць 780 маладых спецыялістаў. Укамплектаванасць кадрамі складае 99 %.

Як падкрэсліў кіраўнік рэгіёна, гарантаванне бяспекі павінна быць забяспечана на самым высокім узроўні. Размова аб абнаўленні сістэм пажарнай аўтаматыкі, установцы электрамагнітных замкоў, відэаназіранні і іншым. Неабходнае фінансаванне на гэтыя мэты выдзелена, таму да пачатку навучальнага года ўсе работы павінны быць завершаны.

## ДАРЭЧЫ

▶ У новым навучальным годзе ў Беларусі будуць працаваць 2627 дзяржаўных устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, вучэбныя заняткі ў якіх пачнуць каля 1,05 млн навучэнцаў. Цяпер у школах праводзяцца рамонтныя работы. Пашпарты гатоўнасці ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі да пачатку навучальнага года павінны быць зацверджаны не пазней за 20 жніўня.


Гімназія № 10 г. Мінска.


Басейн у сярэдняй школе № 2 г. Фаніпаля.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **открытого акционерного общества «Селевцы»** *(Продавец)*
проводит открытый аукцион по продаже:

Лот № 1:

**здание «Молочная» с инв. № 630/С-84634**
**общей площадью 80,9 кв. м,**
**расположенное на земельном участке площадью 0,0937 га с кадастровым номером 623881303601000342 по адресу: Минская область, Молодечненский район, Городокский с/с, аг. Городок, ул. Молодечненская, 58.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона, пл. 0,0937 га; охранная зона электрических сетей, пл. 0,0093 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **8 736,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **873,00** бел. руб.
Стоимость снижена на 20 %.

Лот № 2:

**здание котельной с инв. № 630/С-42625**
**общей площадью 989,3 кв. м**
*(составные части и принадлежности: мазутонасосная, металлическая трансформаторная подстанция, 2 резервуара смешанной конструкции, металлический мазутослив, дымовая труба с дымоходом смешанной конструкции, асфальтобетонное покрытие, 4 металлические емкости, кирпичный бункер мокрого хранения соли, водопроводная сеть протяженностью 270,6 кв. м, канализационная сеть протяженностью 176,8 кв. м, ливневая канализация протяженностью 320,9 кв. м, тепловая сеть протяженностью 26,0 кв. м, газопровод протяженностью 190,5 кв. м, линия освещения протяженностью 248,9 кв. м)*,
**расположенное на земельном участке площадью 1,6196 га с кадастровым номером 623850100003002673 по адресу: Минская область, Молодечненский район, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 31К.**

*На территории земельного участка расположены подземные кабельные ЛЭП напряжением до 10 кВт (пл. 0,1091 га), подземные кабельные ЛЭП напряжением свыше 10 кВт (пл. 0,0157 га), ливневая канализация (пл. 0,3578 га), а также охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,2504 га), канализации (пл. 0,2393 га), теплоснабжения (пл. 0,0966 га) и газоснабжения (пл. 0,1753 га).*

Начальная цена с НДС (20 %) – **211 800,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **21 180,00** бел. руб.
Стоимость снижена на 50 %.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, в следующем размере: 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона в отношении лота № 1, 5 (пяти) процентов в отношении лота № 2.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущее извещение по лоту № 1 опубликовано в газете «Звязда» от 12.04.2025, по лоту № 2 – от 08.02.2024, 02.04.2024, 08.05.2024, 11.06.2024, 09.07.2024.

Аукцион состоится **20.08.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.08.2025** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64.**
**Тел. для осмотра: (80176) 58-92-40, 8 (029) 660-07-55.**

УНН 690019777

ОБЪЯВЛЕНИЕ

**ОАО «БЕЛФА» г. ЖЛОБИН**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 11 августа 2025 г. ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности открытого акционерного общества «БЕЛФА» г. Жлобин по итогам за 1-е полугодие 2025 г.
2. О ликвидации открытого акционерного общества «БЕЛФА» г. Жлобин.
3. Об установлении порядка и срока ликвидации открытого акционерного общества «БЕЛФА» г. Жлобин.
4. О назначении ликвидатора.
5. О передаче полномочий руководителя по управлению делами открытого акционерного общества «БЕЛФА» г. Жлобин ликвидатору.

Собрание состоится в актовом зале административно-бытового корпуса (2-й этаж) Общества по адресу:
**Проезд Красный, 2, г. Жлобин, Гомельская область.**
Начало в 11.00.
Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
Акционеру Общества – паспорт;
Представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, составляется на основании данных реестра владельцев акций по состоянию на 25 июля 2025 года.

С материалами по проведению собрания можно ознакомиться по месту нахождения Общества с 25 июля 2025 года.

УНП 400076540

*Наблюдательный совет.*

УНП 400078768

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» (Республика Беларусь, 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49) сообщает, что внеочередным общим собранием акционеров данного общества, состоявшимся 25.07.2025, принято решение о выплате дивидендов за второй квартал 2025 года – 0 рублей 70 копеек на одну простую (обыкновенную) акцию.

Выплата дивидендов по акциям будет производиться с 28.07.2025 по 31.12.2025.

Порядок выплаты дивидендов акционерам: юридическим лицам – путем зачисления на их расчетные счета, физическим лицам дивиденды зачисляются на их карточные счета либо выплачиваются через кассу ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» или высылаются почтовым переводом (в пределах Республики Беларусь).

# СПАРТЫЎНЫ МЕНЕДЖАР СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ

## У Брэсце дэпутат Вольга СЦЕПУСЬ рэалізоўвае аўтарскі адукацыйны праект

У СВАЁЙ АКРУЗЕ



Член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Вольга Сцепусь нарадзілася і вырасла ў Брэсце. Тут яна атрымала сваю першую вышэйшую адукацыю, тут працавала да таго, як стала парламентарыем. Цяпер прадстаўляе родны горад у высокім заканадаўчым органе краіны. «Брэсцкая цэнтральная акруга № 2 — гэта цэнтр горада, і арганізацыі, прадпрыемствы, установы, якія там знаходзяцца, дазваляюць мне больш шырока раскрыцца ў якасці дэпутата», — кажа яна.

Жыццё Вольгі Сцепусь звязана з фізічнай культурай і спортам. Асабісты прыклад бацькі, Васіля Фаміча, майстра спорту СССР па цяжкай атлетыцы, спартыўнага педагога, а таксама літаратура, прысвечаная спорту, сярод якой расла Вольга, вызначылі яе выбар.

«Гэта дастаткова вялікі шлях — ад прафесійнага спартсмена да спартыўнага менеджара, — расказвае парламентарый пра сваю сувязь са спортам. — У Палату прадстаўнікоў балатавалася з пасады дырэктара аднаго з буйных спартыўных аб'ектаў Беларусі, флагмана краіны — Брэсцкага абласнога цэнтра алімпійскага рэзерву па водных відах спорту. Таму асноўны кірунак маёй перадвыбарнай кампаніі — рэалізацыя ініцыятыў, арыентаваных на падтрымку фізічнай культуры, прафесійнага спорту, фарміраванне здаровага ладу жыцця — усяго, дзе магу быць station прыкладам. Бо штодня займаюся рознымі відамі фізічнай актыўнасці».

Брэст славіцца сваімі спартыўнымі аб'ектамі: тры палацы спорту, два цэнтры алімпійскага рэзерву, вяслярны канал, стралковы цір, лёгкаатлетычны манеж, бейсбольныя палі, некалькі стадыёнаў... Вольга Сцепусь марыць пра тое, каб статус спартыўнай сталіцы стаў для яе горада афіцыйным, і шмат для гэтага робіць цяпер ужо як дэпутат.

«Акрамя спартыўных аб'ектаў, гэта яшчэ і ініцыятывы гараджан, у тым ліку па будаўніцтве профільных дзіцячых пляцовак, вулічнай інфраструктуры. Удзельнічаю ва ўсім гэтым, а таксама па магчымасці бяру ўдзел у праектаванні новых профільных збудаванняў. Удалося прычыніцца да адаптыўных спорту і фізічнай культуры, пабачыць, як у нас займаюцца людзі «сярэбранага» ўзросту, дапамагчы з набыццём спартыўнага інвентару, абсталявання для фізічных заняткаў у сацыяльных і дзіцячых цэнтрах», — пералічвае яна.

Усё гэта арганічна ўвайшло ў яе дэпутацкую дзейнасць, але народная выбранніца пайшла далей. Яна распрацавала і рэалізоўвае ўласны аўтарскі адукацыйны праект «Спартыўны менеджар са знакам якасці». Ён — рэгіянальны, але ў выпадку поспеху можа быць распаўсюджаны на краіну. Ініцыятыва падтрымана кіраўніцтвам парламента і рэгіёна.

«Праект мае шмат мэт: ад павышэння кампетэнцый кіраўніка спартыўнага аб'екта да аказання паслуг насельніцтву і правядзення масавых мерапрыемстваў. Яго адтэрмінаваны сацыяльны эфект дазволіць праз спартыўных менеджараў, якія сёння павінны падстройвацца пад сучасныя інфраструктуру і выклікі, укараняць такія каштоўнасці, як спорт, фізічная культура, здаровы лад жыцця, што ў выніку паўплывае на здароўе нацыі», — расказвае аўтар.

Праект, разлічаны на год, прадугледжвае, што пасля яго заканчэння кожны з 30 удзельнікаў (а гэта кіраў-



нікі або намеснікі) прадставіць план стратэгічнага развіцця свайго аб'екта або рэалізацыі новых масавых мерапрыемстваў. «Ужо нарадзілася ідэя ўключэння інклюзіўных праграм у традыцыйныя спаборніцтвы. Прагучала прапанова аб новым фестывалі «Фітнес і здаровы лад жыцця». Калі ўдасца гэта рэалізаваць, то першы рэгіён прырасце якаснымі мерапрыемствамі, — расказвае прадстаўнік Брэста ў парламенце. — Сёння асноўныя акцэнты нашага жыцця — якасць і эфектыўнасць. Нездарма Прэзідэнт падкрэслівае неабходнасць павышэння ролі кіраўнікоў ва ўсіх сферах».

Пра прафесіяналізм і аўтарытэт Вольгі Сцепусь у сферы спорту сведчыць і той факт, што нядаўна яна ўзначаліла Беларускую федэрацыю плавання. «Гэта дадатковая грамадская нагрузка, якая звязана з развіццём выдатнага віду, прыярытэтнага ў нашай краіне, і прадстаўленні яго на міжнароднай арэне», — каментуе дэпутат новыя абавязкі.

Развіццё на Брэстчыне спорту і фізічнай культуры — адзін з важных вектараў работы дэпутата ў акрузе. Не менш важны — работа з моладдзю. Сустрэч было шмат, але і тут парламентарый глабалізавала задачу, на гэты раз — разам з калегамі.

«Калі ў Палаце прадстаўнікоў быў створаны Маладзёжны савет, дэпутаты з Брэстчыны рэалізавалі яшчэ адзін праект, таксама рэгіянальны — «Партнёрства пакаленняў». Ён інфармацыйна-асветніцкі, мае на ўвазе, што кожны квартал на базе прадпрыемстваў Брэстчыны праходзяць сустрэчы з удзелам як членаў Маладзёжнага савета, так і іх равеснікаў. Мэта — аб'яднаць маладых людзей і паказаць ім патэнцыял роднага рэгіёна. Першы этап адбыўся на РУП «Граніт» у Мікашэвічах. Атрымаўся сапраўды дыялог пакаленняў, адкрытая размова плюс азнаямленне з дзейнасцю ўнікальнага прадпрыемства. Наперадзе — Баранавічы, Камянецкі раён, Брэст...» — расказала Вольга Сцепусь.

Трэці важны вектар дзейнасці дэпутата ў акрузе — работа са зваротамі грамадзян. І тут магчымасці парламентарыя ў многім залежаць ад узаемадзеяння з мясцовымі органамі ўлады. Супрацоўніцтвам з мясцовай вертыкаллю парламентарый задаволена. «Без іх падтрымкі ніякія задумы рэалізаваць не атрымаецца, — кажа яна. — Мы сістэматычна сустракаемся з мэрам Брэста, вызначаем парадак дня, праблемы, перспектывы і ініцыятывы».

Зваротаў грамадзян шмат. Сярод вырашаных — пераход праз чыгунку ў раёне станцыі «Брэст-Палескі». «Там з прычыны небяспекі быў закрыты пераход, але прапанаваны шлях праз пуцеправод для пенсіянераў, асабліва ў дачны сезон, аказаўся няз ручны. Нам удалося знайсці больш прымальны варыянт, зрабіць пераход і бяспечным, і камфортным. Праблему ўдалося вырашыць, дзякуючы падтрымцы мэра, кіраўніка Маскоўскага раёна горада і кіраўніцтва рэгіянальнай чыгункі», — прывяла прыклад парламентарый.

Падсумоўваючы размову, Вольга Сцепусь падкрэслівае: «Мне вельмі важна, каб людзі бачылі ў дэпутаце палітыка з чалавечым тварам. Мы — прадстаўнікі ўлады і адначасова — тыя, хто гатовы дапамагчы, падтрымаць, пачуць кожнага. Здольныя асабістым прыкладам паказаць, што ўсе праблемы вырашальныя, проста некаторыя з іх патрабуюць больш часу і рэсурсаў».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# КЛОПАТЫ ВЯСКОВАГА «МЭРА»

## Старэйшыне ў вёсцы да ўсяго справа ёсць

У Лёзненскім сельсавеце нядаўна прайшло перавыбранне 13 старэйшын населеных пунктаў тэрмінам на два гады. Сярод нававыбраных — даўняя падпісчыца і аўтар «Звязды» Таццяна Ігнаценка з вёскі Чарнаручча. Гэта стала нагодай пазнаёміцца з «нашым чалавекам» бліжэй.



### «РАДА, ШТО МАГУ ЗРАБІЦЬ НЕШТА ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ»

Чарнаручча знаходзіцца ўсяго за два кіламетры ад райцэнтра. У гэтым перавага населенага пункта і разам з тым пэўныя нязручнасці. Бо, напрыклад, аўтобус гарадскога маршруту сюды не даязджае, а прыгарадны прыязджае ў будныя дні толькі два разы: раніцай і а чацвёртай гадзіне дня.

— Сама неяк на фізіяпрацэдуры ездзіла ў Лёзненскую ЦРБ, дык назад ішла пешшу, — кажа суразмоўніца. — А калі жыхары вёскі — людзі немаладыя — едуць у райцэнтр па пакупкі і вяртаюцца дамоў нагружаныя, тады тыя кіламетры ім падаюцца не надта і блізкімі.

Свая крама ў Чарнаруччы зачынілася некалькі гадоў назад. Аўталаўка прыязджае два разы на тыдзень, але ў крамах Лёзна можна скарыстацца сацыяльнымі карткамі і набыць тавар са зніжкай, да таго ж, там большы выбар. Таццяна Ігнаценка ўжо ў якасці старэйшыны плануе даведацца, ці магчыма, каб у Чарнаручча з яго дзвюма з паловай сотнямі жыхароў заязджаў аўтобус гарадскога маршруту хаця б яшчэ разы два на дзень. Як у аграгарадок Зубкі, які знаходзіцца ад Лёзна на такой жа адлегласці. Праўда, там і жыхароў болей у паўтара раза...

Цяпер Таццяна Фядосаўна заклапочана падрыхтоўкай да свята вёскі, якое прызначана на 2 жніўня.

— Хацелася б, каб і тутэйшыя больш актыўна паўдзельнічалі: паспявалі прыпеўкі, нешта расказалі, чымсьці падзяліліся, — прызнаецца старэйшына. — Можа, нехта прадэманструе сваё хобі, прынясе ўласныя вырабы. Таксама нейкі куточак добра было б аддаць старажытным рэчам: збанкам, вышыванкам...

Для ажыццяўлення гэтых планаў ёсць пэўныя абмежаванні. Раней святы ладзіліся каля вясковай крамы, якая знаходзілася на адной з цэнтральных вуліц, ад яе падключалася гукавая апаратура. Пасля закрыцця гандлёвага аб'екта гэта стала немагчымым. У планах старэйшыны Чарнаручча — даведацца пра магчымасць выкарыстоўваць для правядзення культурных мерапрыемстваў адзін з пустых вясковых будынкаў. Каб можна было сабрацца не толькі летам, але і зімовымі вечарамі.

У Чарнаручча Ігнаценкі прыехалі ў 2013-м з вёскі Калышкі, дзе Таццяна Фядосаўна 23 гады адпрацавала ў школе дырэктарам і настаўніцай рускай мовы і літаратуры. «Мне тут вельмі спадабалася — цудоўнае месца і добрыя людзі, — кажа яна. — Я ўжо зрадніласа з імі і рада, што магу нешта для іх зрабіць».

### З АДНАВЯСКОЎЦАМІ НА СУВЯЗІ ШТОДНЯ

— Цалкам згодная з меркаваннем, што старэйшыны — правая рука старшыні сельсавета ў кожным населеным пункце, — дапаўняе маё знаёмства з жыхаркай Чарнаручча старшыня Лёзненскага сельсавета Святлана ПУКАВА. — Гэта мясцовы мэр. Дэпутат — вельмі добра, але, як правіла, у іх некалькі населеных пунктаў, яны сустракаюцца з выбаршчыкамі штомесяц або часцей. А старэйшына вырашае пытанні аднавяскоўцаў штодня. Не заўсёды гэтыя пытанні даходзяць да старшыні, бо многія з іх вырашаюцца самастойна.

Пасля перавыбараў старэйшын усім мясцовым арганізацыям дасылаюцца іх кантакты. Як правіла, па словах старшыні Лёзненскага сельсавета, арганізацыі раённага ўзроўню не ігнаруюць звароты ад старэйшын.

— Перагарэла лямпачка на вулічным ліхтары, некаму трэба дапамагчы абкасіць тэрыторыю, адзінока пражываючаму экстранна спатрэбілася дапамога ў арганізацыі догляду, — прыводзіць Святлана Пукава прыклады праблем, якія дапамагаюць вырашаць старэйшыны. — Яны ўдзельнічаюць у рабоце аглядальных камісій, у Саветах па прафілактыцы, у пасяджэннях выканкамаў і сесій, дзе даюць справаздачу аб выкананай рабоце.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**фота аўтара.**
*в. Чарнаручча Лёзненскага раёна.*

# УЗРОСТ — 1020!..

## Вёска, што захоўвае ўспаміны пра старажытны горад

Паважаныя вяскоўцы, маладыя гарэзніцы ды асілкі са Здзітава, што ў Спораўскім сельсавеце, засведчылі: узрост можа ўпрыгожваць і натхняць. Асабліва, калі гэта ўзрост роднай вёскі, дзе сёння налічваецца 545 жыхароў, якія сабраліся на свята ў яе гонар.

Яно было прысвечана юбілею: 1020 гадоў — і гэта новыя звесткі, якія карэкціруюць ранейшыя веды, замацаваныя на валуне, што быў устаноўлены каля вясковага клуба ў 1998-м. Тады яшчэ першай крыніцай, дзе згадваецца Здзітава, лічыўся Іпацьеўскі летапіс ад 1252 года. Але пазней было ўстаноўлена: Здзітава ўпамінаецца ва «Уставной грамоте об учреждении Туровской епископии» 1005 года. Праўда, археолагі маглі б паспрачацца і засведчыць, што першыя людзі тут пасяліліся ў эпоху неаліту — непадалёк ад вёскі ёсць першабытная стаянка Горбаў-1...

Гэта вельмі маляўнічыя мясціны! А яшчэ і гераічныя: у вайну тут на балотах быў штаб партызан Брэстчыны. Пра гэта даведаліся ворагі і вясной 1944-га ўзялі ў акружэнне партызан і 10 000 мірных жыхароў. Сем дзён доўжылася супрацьстаянне, якое ўвайшло ў гісторыю пад назвай «Здзітаўская абарона». Пра тыя падзеі нагадвае мемарыяльны комплекс, што ўслаўляе партызан, якія выстаялі!..



Удзельнікам тых падзей быў Мікалай Васільевіч Жуковіч, найстарэйшы жыхар вёскі — цяпер яму 97 гадоў. А самаму малодшаму жыхару сённяшняга Здзітава — Уладзіславу Пракурату — 1 год, ён чацвёртае дзіця ў сям'і. У вёсцы жыве некалькі шматдзетных сем'яў. Ёсць моладзь, і наогул шмат актыўных вяскоўцаў, якія з задавальненнем падключыліся да арганізацыі свята. Старшыня Спораўскага сельсавета Наталля Чайчыц адзначае:

— Свята вёскі дазволіла згуртаваць людзей і заахвоціць найбольш актыўных, напрыклад тых, хто дапамагаў у добраўпарадкаванні населенага пункта. Каля ракі Драгабуж надта насваволілі бабры, а нераўнадушныя людзі ачысцілі тэрыторыю. Навучэнцы Здзітаўскай сярэдняй школы на чале з дырэктарам сёлета ўзялі на сябе расчыстку забалочанага ўчастка. А 5 ліпеня ў вёсцы адкрылі экасцежку. У гэтай ініцыятыве актыўна ўдзельнічалі людзі пажылога ўзросту. Неабыякавыя рупліўцы ў паважаным узросце — цудоўны прыклад для моладзі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона, г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) по поручению **КУП «Проектно-производственное архитектурно-планировочное бюро Минского райисполкома» (арендодатель)** проводит открытый аукцион

**по продаже права заключения договора аренды:**

| | Лот № 1 | Лот № 2 |
|---|---|---|
| Наименование объекта | нежилые помещения №№ 13, 14, 15 в капитальном строении с инв. № 500/С-52372 (здание административно-хозяйственное) | нежилые помещения №№ 3, 4, 6, 7 в капитальном строении с инв. № 500/С-52372 (здание административно-хозяйственное) |
| Адрес объекта | г. Минск, ул. Брикета, 9 | г. Минск, ул. Брикета, 9 |
| Площадь, кв. м | 37,3 | 56,2 |
| Срок заключения договора аренды | 1 год | 1 год |
| Начальная цена права заключения договора аренды с НДС (20 %) | 175,18 бел. руб. | 263,94 бел. руб. |
| Сумма задатка | 175,18 бел. руб. | 263,94 бел. руб. |
| Размер ежемесячной арендной платы, БАВ* | 39,17 БАВ (без учета коэффициента для отдельных видов деятельности) 735,13 бел. руб. | 59,01 БАВ (без учета коэффициента для отдельных видов деятельности) 1 107,62 бел. руб. |
| Целевое использование имущества | Для административных целей (размещение персонала и имущества общественных организаций и объединений) | |
| Характеристика, необходимые условия аренды и иные сведения | Имеется: электроснабжение, водоснабжение, отопление, канализация, охранная сигнализация, санузел общий. Возмещение расходов (затрат) арендодателя по коммунальным услугам, услугам, связанным с обеспечением сохранности и безопасности имущества, по санитарному содержанию, по текущему ремонту, по капитальному ремонту, по техническому обслуживанию и прочих расходов по содержанию и эксплуатации капитального строения | |

Аукцион состоится **20.08.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются с даты опубликования извещения по **18.08.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320**.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11,**
**Телефон для осмотра (8017) 510-08-53,**
**сайт в сети интернет: www.rlt.by.**
Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах **au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.**

УНП 690338890



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона)

по поручению **Управления по образованию, спорту и туризму Стародорожского районного исполнительного комитета** (продавец)
**проводит открытый аукцион по продаже**

**изолированного помещения с инв. № 645/D-4595 (наименование/назначение – помещение, не относящееся к жилищному фонду)**
**общей площадью 705,8 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Стародорожский район, г. Старые Дороги, ул. Кирова, 68Б-1**.

Начальная цена без НДС **– 52 400,000** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены **– 5 240,00** бел. руб.
**Стоимость снижена на 80 %.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by.

*Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 03.04.2025.*

Аукцион состоится **21.08.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.08.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64,**
**(8044) 789-10-18, (8029) 136-31-11.**
**Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.**

УНП 690727164



## ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

Объекта строительства
«Возведение многоквартирного жилого дома со сносом капитальных строений с инвентарными номерами 500/С-28900, 500/С-28148, 500/С-28901 по ул. Ф. Скорины, 51 Б»,
*опубликованную в номере от 15.04.2025*

Для заключения договоров долевого строительства с работниками по направлениям от организаций Открытое акционерное общество «АГАТ – системы управления» – управляющая компания холдинга «Геоинформационные системы управления», ОАО «НИИ ЭВМ», ОАО «Агат – электромеханический завод», ОАО «Техника связи» и ОАО «АГАТ-СИСТЕМ» предлагается 130 квартир и 130 машино-мест, в том числе:

УНП 100230470

## Организатор торгов – частное предприятие «ПАКУМ» извещает о проведении повторных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «Мультимоторс Шеринг»

Аукцион состоится **12.08.2025 г. в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Смолячкова, 9, каб. 426

| № лота | Наименование лота (вторые повторные торги со снижением 40 %) | Начальная цена лота с НДС 20 %, руб. | Шаг торгов 5 %, руб. | Задаток 5 %, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Компьютерная линия диагностики легковых автомобилей MAHA SPECIAL 3.2, стенд тормозной роликовый MAHA IW 2 LON, производитель: MAHA (Германия), б/у | 13 306,77 | 665,34 | 665,34 |
| 2 | Стеллажи б/у: 2 секции 6 этажей – 1 шт., 2 секции 7 этажей – 3 шт., 2 секции 8 этажей – 1 шт., 2 секции 9 этажей – 2 шт. | 4 407,71 | 220,39 | 220,39 |
| 3 | Стенд развал-схождения колес 3D RAVTD3000BK, производитель: Ravaglioli (Италия), б/у | 7 573,50 | 378,68 | 378,68 |
| 5 | Зарядная стационарная станция постоянного тока JUNYAN DX-DC80-B для зарядки электромобилей, новая, 2023 г. в. | 10 157,40 | 507,87 | 507,87 |
| **№ лота** | **Наименование лота (первые повторные торги со снижением 10 %)** | **Начальная цена лота с НДС 20 %, руб.** | **Шаг торгов 5 %, руб.** | **Задаток 5 %, руб.** |
| 6 | Легковой седан Chevrolet Cobalt, год выпуска – 2021, 1.5Б, серебристый, с повреждениями | 15 210,00 | 760,50 | 760,50 |
| 7 | Запасные части для легковых автомобилей в ассортименте (перечень на сайте организатора аукциона – https://pakum.by) | 61 770,00 | 3 088,50 | 3 088,50 |

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ООО «Мультимоторс Шеринг», тел. +375291307853 |
| **Организатор торгов** | Частное предприятие «ПАКУМ», г. Минск, ул. Смолячкова, 9-426, тел. +375293321936 |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | Частное предприятие «ПАКУМ», УНП 191274798, р/с BY72 ALFA 3012 2E32 2100 1027 0000 в ЗАО «АЛЬФА-БАНК», г. Минск, БИК ALFABY2X4 |

Заявки на участие в торгах принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в срок **до 15.00 11.08.2025.**
Подробная информация о составе лота на сайте pakum.by.
Осмотр лота в рабочие дни по предварительной записи по тел. +375291307853. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения и определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте организатора аукциона – https://pakum.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ в форме очного аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 130-16Б/2018 в экономическом суде Гомельской области

**Организатор аукциона:** ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by

**Собственник имущества:**
ОАО «Гомельский жировой комбинат», УНП 400078303, 246021, Гомельская область, г. Гомель, ул. Ильича, 4

**Продавец имущества**: ООО «СтанИБор», УНП 491343813, 246017, Гомельская обл., г. Гомель, а/я № 14

| № | Наименование | Нач. цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | Дебиторская задолженность ОАО «Гомельский мясокомбинат» в общем размере 3 794 114,63 бел. руб. Наименование дебитора: ОАО «Гомельский мясокомбинат», УНП 400078293, Гомельская обл., г. Гомель, ул. Ильича, д. 2 (разбита на 50 лотов) | 3 414 703,17 |
| 2 | Дебиторская задолженность ОАО «Гомельский винодельческий завод» в общем размере 168 603,10 бел. руб. Наименование дебитора: ОАО «Гомельский винодельческий завод», УНП 400051877, Гомельская обл., г. Гомель, ул. Рогачевская, д. 10 (разбита на 10 лотов) | 151 742,79 |

Размер задатка – 10 % от начальной цены лота.
Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота

Задаток перечисляется
на р/с BY48OLMP30123000945640000933
в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411,
получатель платежа – ООО «Индустрия Инноваций».
Порядок оформления участия в аукционе,
условия участия и порядок проведения аукциона, информация о полном составе имущества размещены на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» https://iin.by.
Аукцион состоится **29.08.2025** по адресу: 220002, г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, начало 11.00.
Время приема заявок: с 30.07.2025 09.00 до 28.08.2025 г. 17.00.

**Контактные тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95;
e-mail: e.pinchuk@iin.by**


ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ 2025

# АБ'ЯДНАЛІСЯ, КАБ ЗРАБІЦЬ ПРЫГОЖА

## Як у Ваўкавыскім сельсавеце Гродзенскай вобласці рыхтавалі новы пляж






**У вёсцы Хацькоўцы, якая адносіцца да Ваўкавыскага сельсавета, мясцовыя ўлады вырашылі, што абавязкова ў 2025 годзе трэба абнавіць пляж на мясцовым вадасховішчы, каб жыхарам было камфортна адпачываць. Даведаліся, як рыхтавалі зону, а таксама якім чынам наладжана работа з насельніцтвам.**

Можа здацца: што такога? Рэканструявалі пляж і добра — што асаблівага? Але гэта толькі на першы погляд. Дадзеная ініцыятыва аб'яднала вялікую колькасць людзей, якія жадаюць зрабіць сваю малую радзіму яшчэ больш прыгожай і ўтульнай. Як расказаў **старшыня Ваўкавыскага сельсавета Казімір СУЕТА,** прывялі ў парадак пляж за кошт сродкаў, сабраных на раённых суботніках, грашовую дапамогу аказалі і партнёры.

— Работа над зонай адпачынку стала аб'яднаўчым момантам. Удзел у працы прыняло ТАА «Хацькоўцы» — арганізацыя дапамагла з тэхнікай, дзякуючы якой завезлі пясок на пляж. Цяпер ён стаў у два разы большы па плошчы. «Электрасеткі» забяспечылі зону асвятленнем, а «Белтэлекам» — відэаназіраннем. Важна, каб усё было па-сучаснаму. Наш лясгас зрабіў лавачкі з бярвення. Наогул, можна асобны тэкст зрабіць, прысвечаны ўсім партнёрам, якія дапамаглі ў добраўпарадкаванні пляжа. Было прыемна бачыць, наколькі твае землякі неабыякавыя. Для таго, каб да месца адпачынку было зручна дабірацца, паклалі асфальт. Раней гэта была жвіровая дарога. Цяпер жа тут сучаснае пакрыццё. Для зручнасці адпачывальнікаў у выхадныя дні пусцяць дадатковы транспарт.

У гэтым месцы ёсць усё неабходнае для актыўнага баўлення вольнага часу: гульнявыя зоны для дзяцей і пляцоўка для гульні ў валейбол, пірс з катамаранамі, зоны адпачынку з альтанкамі, мангаламі, шэзлонгамі, раздзявальнямі і душавымі.

Дарэчы, новая зона адпачынку актыўна выкарыстоўваецца для правядзення масавых мерапрыемстваў, расказала **намеснік кіраўніка па ідэалагічнай рабоце ТАА «Хацькоўцы» Вольга КРАЎЧАНКА-МАХАНЬКО.** Тут прайшлі «PRO-жарка па-ваўкавыску», а таксама раённы і абласны турзлёты. У выхадны дзень колькасць адпачывальнікаў пераважвае за 1000.

Гэты аб'ект — гэта паказальны прыклад таго, што атрымліваецца, калі людзі на месцах аб'ядноўваюцца і разам працуюць на карысць свайго населенага пункта. Казімір Суета адзначыў, што сельсавет шчыльна працуе з насельніцтвам, імкнучыся зрабіць мясцовасць добраўпарадкаванай. Напрыклад, у аграгарадку Рупейкі ўстанавілі новую дзіцячую пляцоўку.

— Асабліва актуальнае пытанне аварыйных дрэў. Вятры ў Беларусі бываюць вельмі моцнымі, людзі перажываюць за сябе і сваю маёмасць. Таму разам з лясгасам шчыльна працуем у гэтым кірунку. Напрыклад, у Рупейках летась прыбрана 35 аварыйных аб'ектаў. На сталай аснове камісія вызначае, якія дрэвы трэба ліквідаваць. Высечка праходзіць за кошт сродкаў сельсавета.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ,
фота аўтара.**
*г. Ваўкавыск.*



## У тэму

Дарэчы, пад наглядам і на кантролі ў Ваўкавыскім раёне не толькі зоны адпачынку, а ўвогуле ўсе вадаёмы. Як расказаў **першы намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзіслаў ЖУКОЎСКІ,** на тэрыторыі Ваўкавыскага раёна знаходзіцца 25 вадаёмаў і толькі адзін не арандаваны. Але без уладальніка ён зусім з нядаўняга часу.

— Усе арандатары займаюцца таварным рыбалоўствам. Гэта значыць, вырошчваюць рыбу на продаж. Так, 12 вадаёмаў знаходзіцца ў арэндзе ў «Племзавода «Рось», а астатнія — у арэндзе прыватнымі асобамі. Усе азёры арандуюцца ўжо даўно. За добрасумленнасцю арандатараў сочыць камісія, якая перыядычна аб'язджае вадаёмы і кантралюе стан берагоў, каб яны былі абкошаны і ўтрымліваліся ў парадку. Гэты ж орган прысутнічае пры зарыбленні.

Арандатары самастойна займаюцца пошукам рыбнага матэрыялу і рэалізацыяй вырашчанай рыбы. Памер арэнднай платы складае чатыры базавыя велічыні, якія могуць уносіцца адным ці двума плацяжамі за год, умовы аплаты гнуткія і ўзгадняюцца індывідуальна. Поспех супрацоўніцтва з арандатарамі заключаецца ў зладжанай рабоце кіраўніцтва раёна, прыбытковасці гэтай справы для людзей, а таксама ў стабільных умовах арэнды.


Мясцовае Самакіраванне. Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, пр-сп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 12 779. Нумар падпісаны ў 19.30 29 ліпеня 2025 года.**

# АСНОВА НАШАЙ БУДУЧЫНІ

## ДАСТУПНАСЦЬ, АБГРУНТАВАНАСЦЬ, ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ

У Беларусі вызначаны чатыры тэхналагічныя ўзроўні аказання акушэрска-гінекалагічнай перынатальнай дапамогі. Як адзначыла **загадчыца лабараторыі акушэрскай і гінекалагічнай паталогіі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» Святлана ВІКТОР,** яна будуецца на роўнай даступнасці, а ўзровень вызначаецца абгрунтаванасцю і эфектыўнасцю.

— Асноўны пастулат стварэння рознаўзроўневай медыцынскай дапамогі — яна павінна праводзіцца на тым узроўні, дзе маюцца максімальныя для захавання жыцця і здароўя жанчыны і нованароджанага ўмовы, — падкрэсліла Святлана Віктор.

На першым узроўні ажыццяўляюцца дародавае назіранне за цяжарнымі жанчынамі, пастаноўка на ўлік, рэгулярныя агляды, скрынінгі. Дзякуючы дзяржаўным гарантыям і падтрымцы ўсе жанчыны ў Беларусі маюць доступ да дародавага і пасляродавага медыцынскага абслугоўвання. 97 % будучых маці становяцца на ўлік па цяжарнасці да 12 тыдняў і праходзяць абследаванне на выяўленне прыроджаных парокаў развіцця плода.

Адметна, што ўльтрагукавы скрынінг цяжарных дапамагае штогод выяўляць больш за тысячу выпадкаў прыроджаных парокаў. Сёння ён уключае ў сябе пяць даследаванняў: на прыроджаны гіпатырэёз, фенілкетанурыю, мукавісцыдоз, галактаземію і адрэнагенітальны сіндром. Навуковыя распрацоўкі медыкаў РНПЦ і ўкараненне новых метадаў даследавання ў будучыні дадуць магчымасць выяўляць да 12 спадчынных захворванняў, а да 2030 года — да 36.

Пры выяўленні паталогіі цяжарнасці ці захворванняў у дзіцяці пацыенты накіроўваюцца з першага ўзроўню на больш высокія. Задача першага ўзроўню — забеспячэнне даступнасці базавай дапамогі максімальна блізка да месца жыхарства, правядзенне прафілактыкі і прыхільнасці да здаровага ладу жыцця. А вось ужо на другім і трэцім аказваецца дапамога цяжарным пры розных акушэрскіх і саматычных паталогіях. Чацвёрты ўзровень — РНПЦ «Маці і дзіця», куды шпіталізуюцца жанчыны з найбольш цяжкімі захворваннямі. Менавіта тут ажыццяўляецца інтэнсіўная тэрапія выходжвання нованароджаных з усіх рэгіёнаў краіны.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## АПЕРАЦЫЯ ВА ЎЛОННІ МАЦІ

Штогод у РНПЦ пашыраецца спектр хірургічных аперацый падчас цяжарнасці, у тым ліку высокатэхналагічных. З 2009 года ў цэнтры выконваюцца ўнутрыўлонныя аперацыі. У 2023-м было адкрыта спецыяльнае аддзяленне фетальнай хірургіі на 10 ложкаў, дзе штогод выконваецца каля 100 унутрыўлонных аперацый.

Ужо тры гады паспяхова функцыянуе новы корпус клінічнага аддзялення анестэзіялогіі, рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі для нованароджаных. На яго базе арганізаваны банк груднога малака, працуе выязная рэанімацыйна-кансультатыўная брыгада. Для правядзення кансультацый на месцах праводзяцца трэнінгі па пытаннях рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі нованароджаных дзяцей з выкарыстаннем сучаснага сімуляцыйнага абсталявання. У 2021 годзе на базе РНПЦ створаны Рэспубліканскі цэнтр па спадчынных нервова-мышачных захворваннях, падрыхтавана і працуе каманда спецыялістаў для ўвядзення геннай тэрапіі.





Як падкрэсліла Святлана Віктор, на сёння ў РНПЦ «Маці і дзіця» сканцэнтраваны найлепшыя інтэлектуальныя і матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы медыцынскай навукі і практыкі, накіраваныя на вырашэнне задач у галіне аховы мацярынства і дзяцінства. Дзякуючы сваёй структуры, аснашчанасці, укамплектаванасці, высокаму прафесіяналізму і ўкараненню сучасных высокаэфектыўных метадаў цэнтр можа аказаць жанчынам медыцынскую дапамогу на самым высокім сусветным узроўні ў галіне акушэрства, гінекалогіі, неанаталогіі, педыятрыі і медыцынскай генетыкі.

Рознаўзроўневая сістэма — яркі прыклад эфектыўнай арганізацыі аховы здароўя. Беларусь дэманструе ўстойлівы станоўчы вынік у галіне аховы мацярынства і дзяцінства. Наша краіна займае 25-ю пазіцыю ў рэйтынгу самых камфортных для мацярынства дзяржаў, уваходзіць у 50 найлепшых краін свету па вядзенні цяжарнасці і арганізацыі родаў кваліфікаваным медыцынскім персаналам. У рэйтынгу краін шчаслівага дзяцінства Беларусь займае 35-е месца са 175.

— Жанчына — пачатак жыцця, захавальніца здароўя сям'і. Ахова яе здароўя — не проста медыцынская задача, а залог рэалізацыі яе рэпрадуктыўных планаў і нараджэння жаданых і здаровых дзяцей, а значыць, здароўя нацыі, — рэзюмавала Святлана Віктар.

Захаваць вынікі, дасягнутыя спецыялістамі РНПЦ, і не дапусціць далейшага развіцця сур'ёзных паталогій у дзяцей — задача педыятраў у дзіцячых паліклініках. Як адзначыў **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 15-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска Дзяніс ЛАПАЦІН,** на прафілактыку і рэабілітацыю накіраваны асноўныя намаганні дзіцячых медыкаў. Адзін урач-педыятр абслугоўвае каля 800 — 900 дзяцей — гэта сярэдні паказчык па краіне. Неабходныя медыцынскія агляды праводзяцца ў рамках дыспансерызацыі дзіцячага насельніцтва. Адно з самых актуальных пытанняў — вакцынацыя. Сёлета ўведзены новыя прышчэпкі ў Нацыянальны каляндар — ад пнеўмакокавай інфекцыі і віруса папіломы чалавека, таксама дабаўлена дадатковая прышчэпка ад коклюшу, якая робіцца ў шэсць гадоў.

**Алена КРАВЕЦ.**

---

РЭГІЁНЫ

# ВЯЛІКАЯ БУДОЎЛЯ Ў ВАЎКАВЫСКУ

### Як мясцовыя ўлады рыхтуюць горад да абласных Дажынак

2025 ГОД ДАБРАЎПАРАДКАВАННЯ

Ваўкавыскі раён Гродзенскай вобласці з насельніцтвам больш за 41 000 чалавек у гэтым годзе прымае абласныя Дажынкі. Традыцыйна да гэтай падзеі населеныя пункты пераўтвараюцца да лепшага. Як расказаў намеснік старшыні Ваўкавыскага райвыканкама Андрэй КЛУСАЎ, рамонтныя работы набліжаюцца да свайго завяршэння.

Любы план па добраўпарадкаванні ўключае рамонт і будаўніцтва дарог. Гэта тэндэнцыя характэрна для ўсёй Беларусі. Добрымі транспартнымі зносінамі забяспечваюць не толькі буйныя населеныя пункты, але і вёскі, аграгарадкі, пад наглядам знаходзяцца і прасёлачныя дарогі. Рыхтавацца да Дажынак у Ваўкавыску пачалі яшчэ летась — адрамантавалі 14 вуліц, на што было скарыстана больш за тры мільёны беларускіх рублёў. У 2025 годзе работа працягнулася: усяго было запланавана адрамантаваць і добраўпарадкаваць да свята 34 кіламетры дарог, на гэта з бюджэту раёна і вобласці было выдзелена больш за 11 мільёнаў беларускіх рублёў.

— Дарожныя работы знаходзяцца на завяршальнай стадыі, гатоўнасць — больш за 80 %. Пад абнаўленне трапляе не толькі дарожнае пакрыццё, але і тратуары, запланавана замяніць і адрамантаваць 1800 квадратных метраў тратуарнага пакрыцця, а таксама правесці дадатковае асвятленне. Цяпер за сродкі рэспубліканскага бюджэту вядуцца маштабныя работы на вуліцы Соф'і Панковай. Работы па ўстаноўцы вулічнага асвятлення ідуць на вуліцы Барычэўскага, — расказаў суразмоўнік.

Абнавілася цэнтральная плошча, у парку замянілі лаўкі і ўстанавілі новыя апоры асвятлення. Завяршаецца бягучы рамонт, які ўключае афарбоўку фасадаў 27 дамоў жылфонду. На іх наносяць арнаменты і назвы вуліц з нумарамі будынкаў. Праводзяцца рамонт і рэканструкцыя сацыяльна значных аб'ектаў. Завершаны работы па ўцяпленні гарадской паліклінікі і рэканструкцыі старога корпуса дзіцячай. Рамонт у садках і школах павінен быць завершаны да 1 жніўня.

## РАБОТА ПРАЦЯГНЕЦЦА

Ёсць планы і на наступны год, бо сёлета проста немагчыма ўсё зрабіць. Запланавана рэалізацыя праекта па добраўпарадкаванні рэчышча ракі Валкавыя. Будзе створана дадатковая зона адпачынку. Цяпер ідзе распрацоўка праектнай дакументацыі, рака часткова расчышчана. Праект прадугледжвае добраўпарадкаванне сцяжынак, устаноўку асвятлення, а таксама стварэнне веласіпеднай і пешаходнай дарожак. Мясцовыя ўлады плануюць таксама добраўпарадкаваць водаахоўную зону «Дамба».

— У наступным годзе пачнецца рэканструкцыя фізкультурна-аздараўленчага комплексу. Першапачаткова планавалася прывесці ў парадак толькі экстэр'ер, але пасля было



вырашана, што і ўнутранае напаўненне трэба абнавіць. Тэндэр на рэканструкцыю выйграла мінская арганізацыя, і цяпер яны распрацоўваюць праект, — дадае Андрэй Клусаў.

Паступова горад будзе рабіцца ўсё лепш і лепш. Кожнае будаўніцтва або мадэрнізацыя — гэта працаёмкі працэс, які патрабуе немалых грашовых укладанняў. Да абмеркавання праектных рашэнняў прыцягваюцца і жыхары раёна. Андрэй Клусаў падкрэсліў неабходнасць больш актыўнага ўдзелу насельніцтва ў навядзенні парадку, асабліва ў прыватным сектары.

— Стараемся знайсці падыход да жыхароў, сумесна знаходзіць рашэнні. Неўзабаве адбудзецца сход, дзе нагадаем аб тым, што прысядзібныя ўчасткі трэба добраўпарадкоўваць. Аварыйныя канструкцыі, якія не падлягаюць аднаўленню, трэба прыбіраць з тэрыторыі. Санітарная камісія праводзіць абходы, выяўляе парушэнні і нагадвае аб іх устараненні, бо агульнае ўражанне ад насенага пункта складваецца не толькі ад яго цэнтральнай часткі. Калі ўладальнік па якіх-небудзь прычынах не можа навесці парадак сам, напрыклад не дазваляе здароўе, то можна звярнуцца ў мясцовы сельсавет ці райвыканкам і паспрабаваць супольна вырашыць пытанне, — заўважае намеснік старшыні райвыканкама.

Для больш аператыўнага рэагавання на праблемы і недахопы ў Ваўкавыску створаны чат-бот «Стоп Свалка. Волковыск». Жыхары рэгіёна дасылаюць фота і відэа, на якіх адлюстраваны праблемныя месцы, што патрабуюць увагі ўлад.

— Райвыканкам, ЖКГ не могуць быць усюды, таму для таго, каб аператыўна рэагаваць на скаргі жыхароў, і быў створаны чат-бот. Гэта вельмі зручна і дазваляе хутка наводзіць парадак.

Пакуль Ваўкавыск падобны на вялікую будоўлю, але амаль увесь аб'ём работ, запланаваных да Дажынак, будзе выканаеы, а нязручнасці, звязаныя з будаўнічымі работамі, хутка забудуцца... Застанецца толькі прыгажосць!

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**
Фота аўтара.
г. Ваўкавыск.

# ХЛЕБ І СЁННЯ — УСЯМУ ГАЛАВА?



## І пры чым тут азотныя ўгнаенні

У сучасным свеце роля хлеба выходзіць за рамкі простага прадукту харчавання — ён стаў сімвалам развіцця цывілізацыі і найважнейшым элементам гістарычнага прагрэсу. Пра тое, як хлеб і сельская гаспадарка звязаны з нашым мінулым і сучаснасцю, пра ўплыў угнаенняў на развіццё грамадства размаўляем з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гуменам Гарбанніджадам.

***— Гумен, кажуць, што хлеб спрыяў станаўленню цывілізацыі на нашай планеце...***

— Хлеб лічыцца галоўнай ежай чалавецтва на працягу тысячагоддзяў. Самыя раннія сведчанні аб яго вытворчасці, знойдзеныя археолагамі, адносяцца да канца эпохі неаліту, калі чалавек перайшоў ад палявання і збіральніцтва да земляробства. Хлеб выпякаўся з розных кампанентаў: выкарыстоўвалі, як правіла, пшанічную і ржаную муку, радзей — кукурузную, ячменную. І рэцэптура ў кожнага была свая.

З'яўленне хлеба насамрэч не толькі разнастаіла рацыён старажытнага чалавека, але і стала адной з прычын з'яўлення цывілізацыі на нашай планеце. Для таго каб яго спячы, трэба было спачатку развіць на належным узроўні сельскагаспадарчую дзейнасць, якая моцна адрознівалася ад звыклага на той час палявання. Цяпер стала недастаткова пайсці і «заваліць» жывёлу, калі прагаладаўся. З'явілася неабходнасць адсочваць умовы надвор'я, поры года, ад якіх залежыць, калі сеяць зерне і калі збіраць ураджай.

Аднак самае галоўнае, ад чаго залежаў поспех ва ўсім гэтым працэсе, — падзел працы. Кожны работнік павінен быў дакладна выконваць сваю задачу.

Варта яшчэ адзначыць, што на пачатку свайго існавання хлеб адрозніваўся ад таго, які мы прывыклі бачыць сёння. Ён быў падобны на цвёрдыя аладкі. Упершыню выраб, які нагадваў сучасны, больш за 7500 гадоў таму прыгатавалі ў Старажытным Егіпце. Менавіта тут быў выпайдзены працэс ферментацыі — закісання прадуктаў і сыравіны ва ўмовах адсутнасці кіслароду. Бурбалкі вуглякіслага газу, якія ўзнікалі ў працэсе, рабілі цеста пышным і мяккім. Гэта тэхналогія з часам хутка распаўсюдзілася па ўсёй планеце.

У Беларусі існуе шмат разнавіднасцяў хлеба. Турысты заўжды адзначаюць яго высокую якасць і цудоўны смак. А экспарт хлеба ў краінах, дзе яго вытворчасць добра наладжана, — даволі прыбытковы бізнес. Аднак вырошчванне сучасных сельскагаспадарчых культур, з якіх яго вырабляюць, цяжка ўявіць без выкарыстання ўгнаенняў.

***— Вы хочаце сказаць, што сёння менавіта яны рухаюць прагрэс?***

— Калі гаварыць пра ўгнаенні, найперш азотныя, можна сказаць і так. Усё з-за таго, што расліны паглынаюць вялікую колькасць азоту, і калі кожны год вырошчваць на адным кавалку зямлі, скажам, пшаніцу, зямля паступова будзе бяднець на макраэлементы. Вырошчваць трэба шмат, прытым канкурэнтаздольнага збожжа. Для таго каб папоўніць недахопы, і дадаюцца ўгнаенні.

Самае простае з іх — птушыны памёт. Аб яго карысных уласцівасцях людзі даведаліся досыць даўно: на Усходзе да гэтага часу захаваліся старадаўнія галубятні — добры канцэнтрат азотавага ўгнаення.

Амерыканцы ў 1860-х гадах нават ваявалі за маленькія астравы, якія не мелі ні ваеннага, ні стратэгічнага значэння, затое там было шмат скамянелага памёту чаек. Чым больш яны здабывалі ўгнаенняў і, адпаведна, памяншалася колькасць месцаў, дзе яго можна было знайсці, тым хутчэй кошт павышаўся, і войны станавіліся больш жорсткімі.

Англійскі фізік і хімік, вучоны Уільям Крукс яшчэ ў 1898 годзе сказаў, што, калі не зможам штучным шляхам атрымаць азот у найбліжэйшыя трыста гадоў, мы страцім палову насельніцтва планеты. Калі атрымаецца — зможам пракарміць да чатырох мільярдаў людзей, прытым што насельніцтва планеты тады налічвала каля паўтара мільярда чалавек.

***— Але пры ўсёй жыццёвай неабходнасці азоту галоўнае — не перабраць: мы ўсе шмат чулі пра небяспеку нітратаў у агародніне...***

— Нітраты ў нашым арганізме ператвараюцца ў нітрыты — солі азоцістай кіслаты. Без азоту арганізм пачынае «барахліць». Яго фізіялагічная роля асацыіруецца перш за ўсё з бялкамі і амінакіслотамі, іх метабалізмам, удзелам у жыццёва важных працэсах і ўплывам на гэтыя працэсы. Аднак колькасць павінна быць умеранай. Для дарослага чалавека — 5 мг на 1 кг масы цела, для дзіцяці — 0,2 мг на 1 кг масы цела. Дзецям трэба менш, паколькі лішкі з арганізма дрэнна выводзяцца і адмоўна ўплываюць на яго развіццё.

Калі нітратаў у нашым арганізме, якія ператварыліся ў нітрыты, назапашваецца шмат, яны звязваюцца з гемаглабінам, у выніку чаго памяншаецца транспарт кіслароду ў арганізме. Залішнія нітраты ператвараюцца ў нітразамін — моцны канцэраген, які здольны выклікаць нават рак. У кішэчніку з-за гэтага можа павялічвацца колькасць патагеннай мікрафлоры. І ўвогуле можа пачацца моцная інтаксікацыя арганізма.

Умераная колькасць нітратаў у сваю чаргу спрыяе зніжэнню ціску, абараняе сэрца ад ішэмічнай хваробы, павялічвае працаздольнасць у сталым узросце, працуе як прафілактыка сардэчна-сасудзістай сістэмы, пашырае сасуды. Нітраты могуць паступаць у наш арганізм з прадуктаў жывёльнага паходжання і вады.

Падагульняючы, можна сказаць, што разумная колькасць гэтых злучэнняў бяспечная для чалавека. Але сістэматычнае паступленне нітратаў у арганізм, іх ператварэнне ў працэсе абмену рэчываў у нітрыты і іншыя азотазмяшчальныя злучэнні адмоўна ўплываюць на здароўе, асабліва ў людзей сталага ўзросту, у якіх азот дрэнна ўсмоктваецца, за кошт гэтага памяншаецца працаздольнасць.

**Яна ВАЛАСАЧ.**


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**1. Информация о застройщике:**

1.1. Наименование: **Общество с ограниченной ответственностью «АСТОМАКС»,** зарегистрированное в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 20.11.2002 за номером 800017077.

1.2. Местонахождение: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, д. 73, корпус 1, помещение 3Н, кабинет 13.

1.3. Адрес отдела продаж: 220005, г. Минск, пр-т Независимости, д. 37, помещение 116.

1.4. Сведения о режиме работы (отдел продаж): с 09.00 до 20.00 в рабочие дни, с 10.00 до 18.00 в субботу, воскресенье – выходной.

1.5. В течение трех предшествующих опубликованию проектной декларации лет застройщиком построены и введены в эксплуатацию следующие объекты:

| Объекты, № по г.п. | Фактические сроки строительства | Объекты, № по г.п. | Фактические сроки строительства |
|---|---|---|---|
| **Жилые дома в квартале пр-т Независимости – пр-т Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске** | | | |
| 6.1 | ноябрь 2020 – ноябрь 2022 | 6.3 | ноябрь 2020 – январь 2023 |
| 6.2 | ноябрь 2020 – январь 2023 | 7.1–7.3 | декабрь 2020 – ноябрь 2024 |
| **Иные объекты недвижимости в квартале пр-т Независимости – пр-т Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске** | | | |
| Паркинг 6.4 | ноябрь 2020 – ноябрь 2022 | Паркинг 7.4 | декабрь 2020 – сентябрь 2024 |

**2. Информация об объекте строительства.**

2.1. Объект строительства – многоквартирный жилой дом № 9.4 по генплану в составе объекта: «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения и подземными паркингами в квартале пр-т Независимости – пр-т Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске». 9-я очередь строительства. Жилые дома 9.1–9.4 по г. п., гараж-стоянка 9.5 по г. п., объект социально-общественного назначения 9.6 по г. п. – возводятся с целью обеспечения потребностей населения жилыми помещениями и реализации проекта по строительству жилых домов повышенной комфортности в составе объекта: «Жилой комплекс с объектами социально-общественного назначения и подземными паркингами в квартале пр-т Независимости – пр-т Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске».

2.2. Возведение объекта строительства осуществляется согласно этапам, предусмотренным графиками производства строительных работ, предполагаемый срок окончания строительства (приёмки в эксплуатацию) – не позднее 16.06.2027.

2.3. Проектная документация имеет положительные заключения государственной экспертизы № 498-15/21 от 27.10.2021, № 89-15/24 от 19.03.2024, № 864-15/24 от 16.12.2024, выданные республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

Застройщик имеет право в одностороннем порядке изменять проектную документацию без дополнительных согласований с дольщиками.

Возведение объекта строительства осуществляется в квартале пр. Независимости – пр. Машерова – ул. Красной – ул. Киселева в г. Минске на земельном участке с кадастровым номером 500000000007008756 площадью 6,7675 га, принадлежащем на праве собственности Республике Беларусь и предоставленном застройщику на праве аренды (свидетельства (удостоверения) №500/1719-9586 от 19.06.2020 и №500/706-6695 от 28.10.2021 о государственной регистрации, выданные РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»).

2.4. Строительство объекта строительства предусмотрено по индивидуальному проекту.

Объект строительства – многоквартирный жилой дом, односекционный, представляет собой шестиэтажный объем, с цокольным этажом.

Конструктивная схема здания объекта строительства – монолитный рамно-связевый каркас.

В объекте строительства предусмотрены необходимые виды инженерных систем.

Предусматривается комплексное благоустройство дворовой территории объекта строительства.

Объект строительства возводится в составе квартала жилой застройки, имеющей общую территорию квартала (далее – «Квартал»).

2.5. В состав общего имущества совместного домовладения объекта строительства и Квартала входит имущество, отнесенное законодательством к общему имуществу многоквартирного дома, а также внутриплощадочные и внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения, объекты, связанные с объектом строительства, относящиеся к нему в соответствии с проектной документацией и расположенные на территории Квартала, в том числе объекты благоустройства и озеленения территории, наружные внутри- и внеквартальные инженерные сети электроснабжения, электроосвещения, теплоснабжения, водоснабжения, канализации, связи, в том числе телефонизация, диспетчеризация лифтов, ТП. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации объекта строительства. Дворовые элементы озеленения и благоустройства (детские и спортивные площадки, площадки для отдыха, проезды, тротуары), автомобильные проезды и подходы создаются для обеспечения всех многоквартирных жилых домов, входящих в Квартал.

Объекты инженерно-транспортной инфраструктуры, находящиеся за пределами наружного контура объекта строительства, входящие в состав общего имущества объекта строительства, а также объекты магистральной и распределительной инженерной инфраструктуры, финансируемые при строительстве объекта, передаются застройщиком на безвозмездной основе эксплуатирующим их организациям как сумма затрат по их строительству в установленном законодательством порядке. Заключая договор создания объекта долевого строительства, дольщик даёт тем самым согласие на безвозмездную передачу указанного имущества. Перечень передаваемых объектов и формирование суммы затрат по их строительству производится застройщиком.

В состав общего имущества совместного домовладения не входят и поступают в собственность застройщика изолированные нежилые помещения (вне зависимости от их функционального назначения, которое определяется проектной документацией), машино-места (кроме возводимых для дольщиков (покупателей) машино-мест на основании отдельного договора), сети электроснабжения к станциям зарядки электромобилей и оборудование станций зарядки электромобилей (в случае его установки, кроме установки такого оборудования для дольщиков (покупателей) на основании отдельного договора).

2.6. Между застройщиком и подрядчиками заключены договоры строительного подряда:

- с ООО «СпецГрузМастер» № 111124-1 от 11.11.2024;
- с унитарным предприятием «СУ № 21 ОАО «Минскпромстрой» №11 от 22.01.2025.

2.7. Ознакомление застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству осуществляется путем предоставления информации по адресу отдела продаж либо путём размещения информации на сайте kvartaldepo.by.

2.8. Объект строится на коммерческой основе, заключение договоров создания объектов долевого строительства предлагается гражданам, не состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, и юридическим лицам. Обязанность привлекать граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, при долевом строительстве объекта у застройщика отсутствует.

2.9. Количество объектов долевого строительства, предлагаемых для заключения договоров – 25 единиц, которые имеют общую площадь жилого помещения (согласно ТКП 45-3.02-324-2018) от 46,05 до 117,74 м².

Общая площадь объектов долевого строительства, в отношении которых будут заключаться договоры создания объектов долевого строительства, составляет 1929,21 м².

Цена одного квадратного метра общей площади жилого помещения (согласно ТКП 45-3.02-324-2018) объектов долевого строительства составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную 9200 долларам США. Цена объекта долевого строительства составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную сумме в долларах США, равной произведению цены одного квадратного метра общей площади жилого помещения и общей площади жилого помещения (согласно ТКП 45-3.02-324-2018) соответствующего объекта долевого строительства. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа, если иной курс или иная дата его определения не установлены договором.

По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка от цены объекта долевого строительства (квадратного метра общей площади жилого помещения) в зависимости от общей площади, типа планировки и/или отделки (оснащения мебелью и (или) оборудованием (бытовой техникой)) объекта долевого строительства, этажа объекта долевого строительства, размера первоначального взноса и графика внесения платежей за объект долевого строительства.

Изменение цены объекта долевого строительства застройщиком в одностороннем порядке может быть произведено в случае нарушение дольщиком условий предоставления скидки, а также в иных случаях, предусмотренных договором создания объекта долевого строительства, иным соглашением сторон.

2.10. Прием заявлений о заключении договоров создания объектов долевого строительства осуществляется при заключении названных договоров через 7 дней после опубликования настоящей декларации. В случае если договор создания объекта долевого строительства не будет заключён в течение 3 (трёх) календарных дней с момента подачи заявления о его заключении, такое заявление утрачивает силу.

Заключение договоров создания объектов долевого строительства осуществляется в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263

# УДАР ПА ПЕЧАНІ

## Гепатыт можа схавана развівацца гадамі

**По звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, штогод вірусныя гепатыты забіраюць каля 1,3 мільёна жыццяў, або 3,5 тысячы штодня. Захворванне можа справакаваць не адзін вірус, а цэлая іх група: A, B, C, D, E і інш. Гепатыты A і E называюць «хваробай брудных рук», яны, як правіла, больш лёгкія і не пераходзяць у хранічныя формы. А вось самымі небяспечнымі лічацца вірусы B і C. Яны могуць бессімптомна працякаць гадамі.**

### ПРЫКЛАД ДЛЯ ЕЎРАПЕЙСКАГА РЭГІЁНА

У Беларусі захваральнасць на гепатыты паступова зніжаецца. Летась яна зменшылася на 30 % у параўнанні з 2023-м. І ў гэтым кірунку, як адзначыў **прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь Сяргей ДЫЯРДЗІЦА,** наша краіна мае істотныя дасягненні.

— Беларусь з'яўляецца прыкладам для еўрапейскага рэгіёна, бо праводзяцца маштабныя работы па імунізацыі: 97-98 % дзяцей атрымліваюць вакцыну, яна ўводзіцца адразу пасля нараджэння, а калі пасля малое атрымлівае яшчэ тры дозы, гэта гарантуе амаль стапрацэнтную абарону ад заражэння гепатытам B. У 2022 годзе Міністэрства аховы здароўя пры падтрымцы СААЗ праводзіла нацыянальнае сералагічнае даследаванне, якое паказала, што гепатыт B у дзяцей, якія нарадзіліся пасля пачатку вакцынацыі, амаль ліквідаваны, — паведаміў прадстаўнік СААЗ, дадаўшы, што арганізацыя падтрымлівае нашу краіну ў атрыманні рэкамендацый, навучанні спецыялістаў, абмене вопытам.

Як падкрэсліла **загадчыца аддзела прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ірына ГЛІНСКАЯ,** у сістэме аховы здароўя Беларусі няма перашкод, якія б абцяжарвалі папярэджанне гепатытаў і іх раннюю дыягностыку. Створаны ўсе ўмовы, каб кожны чалавек мог звярнуцца ў любую арганізацыю аховы здароўя і прайсці скрынінгавыя абследаванні на гепатыты. Пры атрыманні станоўчых вынікаў пацыента накіруюць на ўдакладняльнае абследаванне і, у выпадку пацвярджэння дыягназу, прызначаць лячэнне.



### ПРЫШЧЭПКІ, АБСЛЕДАВАННІ

Гэта тое, што дазваляе засцерагчыся ад заражэння гепатытам. У прыватнасці, супраць гепатыту B існуе эфектыўная вакцына. Яна з'явілася дастаткова даўно: выкарыстоўваецца ў Беларусі з 1996 года, а з 2000-га ўвайшла ў Нацыянальны каляндар прафілактычных прышчэпак. Тактыка вакцынацыі на працягу гэтага перыяду мянялася. Такім чынам, у Беларусі людзі ва ўзросце да 25 — нават 30 — гадоў прайшлі вакцынацыю і абаронены.

— Гэта значыць, яны атрымалі ў розныя перыяды свайго жыцця вакцынацыю, якая стварае абарону на працяглы перыяд — 20 гадоў і больш. Таму выпадкаў захворвання на гепатыт B у гэтай узроставай катэгорыі практычна не рэгіструецца, — адзначыла Ірына Глінская.

Найлепшыя вынікі вакцынацыі сярод дзяцей. Калі ў давакцынальны перыяд сярод дзяцей да 14 гадоў узнікала больш за 100 выпадкаў гепатыту B у год, то сёння заражэнняў у гэтай узроставай катэгорыі ўвогуле няма. Прышчэпку ад гепатыту B па эпідэмічных паказаннях могуць зрабіць і дарослым з груп рызыкі заражэння гепатытам B. Гэта медыцынскія работнікі, асобы, якія кантактуюць, у тым ліку ў быце, з пацыентамі з хранічным гепатытам B. Дарэчы, з 2025 года гэты пералік пашырыўся за кошт асобных груп, якія маюць павышаныя рызыкі заражэння, у прыватнасці за кошт сексуальных кантактаў, іншых рызыкоўных форм паводзін.

Што датычыцца гепатыту C, існуе яго эфектыўнае лячэнне. У арсенале медыкаў ёсць прэпараты прамога дзеяння, якія маюць эфектыўнасць каля 95 %.

**Алена КРАВЕЦ.**


# Уведомление о проведении общественных обсуждений экологического доклада по стратегической экологической оценке (далее – СЭО) проекта Программы комплексной модернизации производств газовой сферы на 2026–2030 годы

| | |
|---|---|
| **Информация о государственном органе, планирующем разработку документации (наименование, юридический, почтовый и электронный адреса, номера телефона и факса)** | **Министерство энергетики Республики Беларусь, 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 14, e-mail: minenergo@minenergo.gov.by, тел. (017) 218-21-02, факс (017) 218-24-68. Государственное производственное объединение по топливу и газификации «Белтопгаз» (ГПО «Белтопгаз»), 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 14, e-mail: mail@topgas.by, тел. (017) 311-30-33, факс (017) 270-62-14** |

**Наименование документа планирования, для которого проводится стратегическая экологическая оценка, описание**

Стратегическая экологическая оценка проводится для проекта Программы комплексной модернизации производств газовой сферы на 2026–2030 годы (далее – Программа).
Целью Программы является развитие, обновление и совершенствование производств газовой сферы для обеспечения надежности, безопасности и эффективности газоснабжения.
Основные направления программы: поддержание технически исправного состояния объектов газораспределительной системы для повышения безотказности ее работы; обновление основных средств газоснабжающих организаций для повышения надежности и управляемости газораспределительной системы; повышение эффективности выполнения работ при эксплуатации объектов газораспределительной системы и повышения качества предоставляемых услуг потребителям.

Основные направления программы:

- развитие газораспределительной системы Республики Беларусь и обеспечение надежного и бесперебойного газоснабжения всех категорий потребителей является возведение новых объектов газораспределительной системы (в том числе закольцовок, параллельных участков газопроводов (лупингов) для увеличения пропускной способности основных участков, возведение подводящих газопроводов к населенным пунктам для перевода на природный газ потребителей, газоснабжение которых осуществлялось от резервуарных установок сжиженного газа, возведение пунктов редуцирования газа, узлов учета газа, средств ЭХЗ.
- реконструкция и модернизация действующих объектов газораспределительной системы, в том числе отдельных участков газопроводов, пунктов редуцирования газа, средств ЭХЗ, а также объектов ГНС (ГНП), АГЗС, РУ СУГ, что позволит повысить безотказность и долговечность газораспределительной системы, а также минимизировать возникновение возможных аварийных ситуаций и инцидентов.
- обеспечение автоматизации управления объектами газораспределительной системы в рамках концепции развития «умных» городов: оснащение зон защиты установок ЭХЗ системой «интеллектуальный КИП», телемеханизация отключающих устройств на распределительных газопроводах, установка на ГРП технологического оборудования с дистанционным управлением и возможностью автоматической регулировки давления газа, установка на газопроводах пунктов контроля давления и скорости потока газа.
- развитие материально-технической базы газоснабжающих организаций и цифровой трансформации.

Мероприятия Программы:

1. Возведение и реконструкция газопроводов и сооружений на них, в том числе возведение газопроводов для перевода газоснабжения потребителей с сжиженного газа от РУ СУГ на природный газ.
2. Возведение, реконструкция, модернизация пунктов редуцирования газа.
3. Возведение, реконструкция, модернизация средств ЭХЗ и узлов учета газа.
4. Реконструкция и модернизация объектов ГНС (ГНП), АГЗС, РУ СУГ, в том числе в целях организации защиты критически важных объектов.
5. Возведение, реконструкция, модернизация производственных баз, мини-котельных, котельных ПУ и РГС, учебно-тренировочных комплексов (площадок), учебных классов.
6. Разработка проектной документации на возведение, реконструкцию, модернизацию объектов.
7. Приобретение современных высокоэффективных приборов и оборудования (не входящих в сметы строительства), в том числе в целях организации защиты критически важных объектов.
8. Обновление парка транспортных средств оперативного и специального назначения.
9. Развитие систем телеметрии (телемеханизации) и автоматизации технологических процессов, систем связи и передачи данных.
10. Развитие и модернизация информационных систем, систем автоматизации бизнес-процессов, систем обеспечения информационной безопасности, кибербезопасности информационных ресурсов.
11. Плановые и регламентные работы при эксплуатации газопроводов.
12. Плановые и регламентные работы при эксплуатации пунктов редуцирования газа.
13. Плановые и регламентные работы при эксплуатации объектов ГНС (ГНП), АГЗС, РУ СУГ.
14. Плановые и регламентные работы при эксплуатации средств ЭХЗ.
15. Комплектация запаса.
16. Капитальные ремонты производственных баз, мини-котельных ПУ и РГС, учебно-тренировочных комплексов (площадок), учебных классов.
17. Вывод из эксплуатации объектов газораспределительной системы и сооружений на них.
18. Разработка, корректировка схем газоснабжения и защиты газопроводов от электрохимической коррозии.
19. Разработка и актуализация локальных нормативных документов, методик, инструкций.
20. Сопровождение и техническая поддержка программных продуктов, в том числе для обеспечения информационной безопасности, кибербезопасности информационных ресурсов, организации защиты критически важных объектов.
21. Подготовка и переподготовка кадров. Образование.

Программа соответствует основным направлениям развития топливно-энергетического комплекса на долгосрочную перспективу и обеспечения энергетической безопасности, определенным Концепцией энергетической безопасности Республики Беларусь

| | |
|---|---|
| **Информация о принимаемом решении в отношении документа планирования и государственном органе, ответственном за принятие такого решения** | Программа утверждается Постановлением Министерства энергетики Республики Беларусь |
| **Сроки проведения общественных обсуждений с указанием даты их начала и окончания** | Начало – 04.08.2025 г., окончание – 02.09.2025 г. |
| **Сроки и порядок направления замечаний и предложений по экологическому докладу по СЭО** | Замечания и предложения по экологическому докладу по СЭО можно направлять заказным письмом, в письменном виде (нарочно) или по электронной почте в период с 04.08.2025 по 02.09.2025 |

**Информация о том, где можно ознакомиться с экологическим докладом по СЭО и куда необходимо направлять замечания и предложения (наименование, почтовый адрес, адрес сайта в сети Интернет, фамилия, собственное имя, отчество (при наличии), должность контактного лица, номера телефона и факса, электронный адрес)**

Ознакомиться с экологическим докладом по СЭО в электронном виде можно в разделе «Общественные обсуждения» на сайтах: http://www.bgtg.by, http://www.topgas.by, https://minsk.gov.by/ru, http://brest-region.gov.by, http://www.vitebsk-region.gov.by, http://www.gomel-region.gov.by, http://www.minsk-region.gov.by, http://mogilev-region.gov.by.
Ознакомиться с экологическим докладом по СЭО на бумажном носителе и направлять замечания и предложения можно по следующим адресам:
Государственное предприятие «НИИ Белгипротопгаз», 220036, г. Минск, пер. Домашевский, 11А, http://www.bgtg.by, телефон приемной (017) 289-43-01, контактное лицо – начальник экологического отдела Монетина Надежда Васильевна, телефон (017) 289-43-36, факс (017) 289-43-01, e-mail: ecolog@bgtg.by; belgiprotopgaz@bgtg.by;
Государственное производственное объединение по топливу и газификации «Белтопгаз» (ГПО «Белтопгаз»), 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 14, http://www.topgas.by, телефон приемной (017) 311-30-33, контактное лицо – начальник управления капитального строительства Терехова Оксана Валерьевна, тел. (017) 311-31-06, e-mail: stroyka@topgas.by;
Минский городской исполнительный комитет, 220030, г. Минск, пр-т. Независимости, 8, https://minsk.gov.by, телефон приемной (017) 227-44-33, контактное лицо – первый заместитель председателя комитета архитектуры и градостроительства Микульский Иван Валерьевич, тел. (017) 304-79-74, факс (017) 282-82-89, e-mail: kaig@minsk.gov.by;
Брестский областной исполнительный комитет, 224005, г. Брест, ул. Ленина, 11, http://brest-region.gov.by, телефон приемной (0162) 26-95-06, контактное лицо – заместитель начальника управления жилищно-коммунального хозяйства Чепукойть Павел Юрьевич, тел. (0162) 26-97-12, e-mail: komhoz@brest-region.gov.by;
Витебский областной исполнительный комитет, 210010, г. Витебск, ул. Гоголя, 6, http://www.vitebsk-region.gov.by, телефон приемной (0212) 48-11-55, контактное лицо – заведующий сектором энергетики и топлива комитета по архитектуре и строительству Гришанов Александр Анатольевич, тел. (0212) 48-21-67, e-mail: kaiszam2@vitobl.by;
Гомельский областной исполнительный комитет: 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 2, http://www.gomel-region.gov.by, телефон приемной (0232) 33-45-19, контактное лицо – главный специалист отдела энергетики и топлива Ворушило Павел Андреевич, тел. (0232) 33-43-72, e-mail: energy@oblispolkom-gomel.by (письмо Гомельского областного исполнительного комитета от 14.07.2025 № 01-21/12723);
Гродненский областной исполнительный комитет, 230023, г. Гродно, ул. Ожешко, 3, http://www.grodno-region.gov.by, телефон приемной (0152) 72-31-90, контактное лицо – заместитель председателя – начальник отдела энергетики, транспорта и связи комитета по архитектуре и строительству Прилепская Наталья Вячеславовна, тел. (0152) 73-55-96, факс (0152) 73-55-97, e-mail: energy@grodno-region.gov.by;
Минский областной исполнительный комитет, 220030, г. Минск, ул. Энгельса, 4, http://www.minsk-region.gov.by, телефон приемной (017) 500-41-44, контактное лицо – начальник отдела энергетики и топлива управления жилищно-коммунального хозяйства, энергетики и топлива Музок Татьяна Геннадьевна, тел. (017) 501-02-15, e-mail: enrergytop@minsk-region.gov.by;
Могилёвский областной исполнительный комитет, 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 71, http://www.mogilev-region.gov.by, телефон приемной (0222) 32-67-91, контактное лицо – заместитель начальника отдела контроля за охраной и использованием земель, недр, биоразнообразия, особо охраняемых природных территорий Могилевского областного комитета природных ресурсов и охраны и охраны окружающей среды Стасюкевич Елена Владимировна, тел. (0222) 64-78-89, e-mail: zem@mogilevpriroda.gov.by

**Сроки и порядок направления заявления о необходимости проведения собрания по обсуждению экологического доклада по СЭО**

Заявления о необходимости проведения общественного собрания можно направить в течении 10 рабочих дней с даты начала общественных обсуждений (с 04.08.2025 г. по 15.08.2025 г.) на почтовые и электронные адреса:
Государственное предприятие «НИИ Белгипротопгаз», 220036, г. Минск, пер. Домашевский, 11А, http://www.bgtg.by, телефон приемной (017) 289-43-01, контактное лицо – начальник экологического отдела Монетина Надежда Васильевна, телефон (017) 289-43-36, факс (017) 289-43-01, e-mail: ecolog@bgtg.by; belgiprotopgaz@bgtg.by;
Государственное производственное объединение по топливу и газификации «Белтопгаз» (ГПО «Белтопгаз»), 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 14, http://www.topgas.by, телефон приемной (017) 311-30-33, контактное лицо – начальник управления капитального строительства Терехова Оксана Валерьевна, тел. (017) 311-31-06, e-mail: stroyka@topgas.by;
Минский городской исполнительный комитет, 220030, г. Минск, пр-т Независимости, 8, https://minsk.gov.by, телефон приемной (017) 227-44-33, контактное лицо – первый заместитель председателя комитета архитектура и градостроительства Микульский Иван Валерьевич, тел. (017) 304-79-74, факс (017) 282-82-89, e-mail: kaig@minsk.gov.by;
Брестский областной исполнительный комитет, 224005, г. Брест, ул. Ленина, 11, http://brest-region.gov.by, телефон приемной (0162) 26-95-06, контактное лицо – заместитель начальника управления жилищно-коммунального хозяйства Чепукойть Павел Юрьевич, тел. (0162) 26-97-12, e-mail: komhoz@brest-region.gov.by;
Витебский областной исполнительный комитет, 210010, г. Витебск, ул. Гоголя, 6, http://www.vitebsk-region.gov.by, телефон приемной (0212) 48-11-55, контактное лицо – заведующий сектором энергетики и топлива комитета по архитектуре и строительства Гришанов Александр Анатольевич, тел. (0212)48-21-67, e-mail: kaiszam2@vitobl.by;
Гомельский областной исполнительный комитет: 246050, г. Гомель, пр. Ленина, 2, http://www.gomel-region.gov.by, телефон приемной (0232) 33-45-19, контактное лицо – главный специалист отдела энергетики и топлива Ворушило Павел Андреевич, тел. (0232) 33-43-72, e-mail: energy@oblispolkom-gomel.by (письмо Гомельского областного исполнительного комитета от 14.07.2025 № 01-21/12723);
Гродненский областной исполнительный комитет, 230023, г. Гродно, ул. Ожешко, 3, http://www.grodno-region.gov.by, телефон приемной (0152) 72-31-90, контактное лицо – заместитель председателя – начальник отдела энергетики, транспорта и связи комитета по архитектуре и строительству Прилепская Наталья Вячеславовна, тел. (0152) 73-55-96, факс (0152) 73-55-97, e-mail: energy@grodno-region.gov.by;
Минский областной исполнительный комитет, 220030, г. Минск, ул. Энгельса, 4, http://www.minsk-region.gov.by, телефон приемной (017) 500-41-44, контактное лицо – начальник отдела энергетики и топлива управления жилищно-коммунального хозяйства, энергетики и топлива Музок Татьяна Геннадьевна, тел. (017) 501-02-15, e-mail: enrergytop@minsk-region.gov.by;
Могилёвский областной исполнительный комитет, 212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 71, http://www.mogilev-region.gov.by, телефон приемной (0222) 32-67-91, контактное лицо – заместитель начальника отдела контроля за охраной и использованием земель, недр, биоразнообразия, особо охраняемых природных территорий Могилевского областного комитета природных ресурсов и охраны и охраны окружающей среды Стасюкевич Елена Владимировна, тел. (0222) 64-78-89, e-mail: zem@mogilevpriroda.gov.by

УНП 100122818

# НЕКАНВЕНЦЫЯнальнае рашэнне

## Чаму нашы суседзі выйшлі з Атаўскай канвенцыі. Якую небяспеку гэта нясе?

**Краіны Балтыі, Польшча выйшлі з Канвенцыі аб забароне супрацьпяхотных мін. Прычынай яны назвалі пагрозу з боку Расіі. Масква заявіла, што гэта рашэнне прывядзе да далейшай эскалацыі напружанасці ў рэгіёне.**




Яшчэ 18 сакавіка Латвія, Літва, Эстонія і Польшча (пакінем у дужках таксама Фінляндыю, якая паступіла аналагічна) заявілі аб выхадзе з Атаўскай канвенцыі аб забароне супрацьпяхотных мін. Сваё рашэнне яны матывавалі тым, што з моманту ратыфікацыі гэтага дакумента сітуацыя з бяспекай у Еўропе пагоршылася, а ваенныя пагрозы краінам НАТА, якія мяжуюць з Расіяй і Беларуссю, «значна ўзмацніліся».

«У святле гэтай нестабільнай абстаноўкі, адзначанай расійскай агрэсіяй і яе працяглай пагрозай еўра-атлантычнай супольнасці, жыццёва важна ацаніць усе меры па ўмацаванні нашых магчымасцяў стрымлівання і абароны, — гаворыцца ў сумеснай заяве міністраў абароны чатырох краін, якія прапанавалі свайму кіраўніцтву выйсці з Атаўскай канвенцыі. — Гэтым рашэннем мы пасылаем выразны сігнал: нашы краіны гатовыя і могуць выкарыстоўваць усе неабходныя меры для абароны нашай тэрыторыі і свабоды». Аднак у дакуменце падкрэсліваецца, што чатыры краіны застаюцца адданымі гуманітарнаму праву, у тым ліку і абароне грамадзянскіх асоб падчас узброенага канфлікту.

**Канвенцыя аб забароне прымянення, назапашвання запасаў, вытворчасці і перадачы супрацьпяхотных мін і аб іх знішчэнні (Атаўская канвенцыя) была падпісана 3 снежня 1997 года ў Атаве, набыла сілу ў 1999-м. Яе ўдзельнікі абавязваюцца не прымяняць, не распрацоўваць, не вырабляць, не набываць, не назапашваць, не захоўваць і не перадаваць іншым бакам супрацьпяхотныя міны; яны абавязаны на працягу чатырох гадоў, пасля таго як дакумент уступіць у сілу, знішчыць усе запасы гэтых боепрыпасаў. Удзельнікі таксама павінны штогод паведамляць аб сваіх запасах, ходзе праграм іх знішчэння і аб усіх замініраваных супрацьпяхотнымі мінамі раёнах.**

**Да канвенцыі сёння далучыліся 164 краіны. Латвія ратыфікавала дакумент у 2005 годзе, Літва — у 2003-м, Эстонія — у 2004-м, Польшча — у 2012-м. З краін-удзельніц Атаўскай канвенцыі 94 поўнасцю знішчылі свае запасы супрацьпяхотных мін. Свае абавязкі знішчыць міны не выканалі Украіна (у 2024 годзе ў яе было 3,3 млн мін) і Грэцыя.**

Выхад з канвенцыі дазволіць краінам Балтыі і Польшчы аднавіць вытворчасць супрацьпяхотных мін, растлумачыў міністр абароны Латвіі Андрыс Спрудс. «Мы павінны быць гатовы да таго, што Расія будзе працягваць уяўляць пагрозу нашаму рэгіёну, незалежна ад выніку вайны Расіі ва Украіне», — напісаў ён у сацсетцы X, адзначыўшы, што выхад з канвенцыі накіраваны на ўмацаванне меж чатырох краін.

Перш чым рэкамендаваць такую меру, удакладніў Спрудс, міністэрства абароны Латвіі і яе ўзброеныя сілы прааналізавалі эфектыўнасць супрацьпяхотных мін, пазіцыі саюзнікаў, а таксама магчымую пакупку і вытворчасць гэтых боепрыпасаў. «Падчас ацэнкі была зроблена высновa аб магчымасці развіцця вытворчасці супрацьпяхотных мін у Латвіі і краінах рэгіёна. Неабходныя магчымасці ёсць у латвійскай прамысловасці, у рэспубліцы развіта металаапрацоўка. Рэгіянальны падыход дазволіць знізіць залежнасць ад замежных паставак, асабліва пры вытворчасці выбуховых рэчываў і боегаловак», — гаворыцца ў паведамленні латвійскага абароннага ведамства.

Польшча таксама плануе вырабляць міны самастойна: як заявіў намеснік міністра абароны Павел Бэйда, у планах выпусціць 1 млн штук, рабіць гэта будуць заводы Польскай збраевай групы (дзяржаўны холдынг, які аб'ядноўвае дзясяткі абаронных кампаній). Размяшчаць міны плануецца ў рамках ініцыятывы «Усходні шчыт», накіраванай на стварэнне ў краіне прыгранічных умацаванняў. «У нас няма выбару. Сітуацыя на мяжы сур'ёзная. Гаворка ідзе пра польска-беларускую і польска-расійскую межы», — сказаў Бэйда.

Міністэрства абароны Літвы дадаткова звярнула ўвагу, што Расія ў Атаўскай канвенцыі не ўдзельнічае. «У яе велізарныя запасы супрацьпяхотных мін, якія яна актыўна выкарыстоўвае супраць Украіны, што падпісала Атаўскую канвенцыю, — гаворыцца ў заяве ведамства (Кіеў далучыўся да яе ў 2005 годзе, а ў 2024-м ЗША адобрылі пастаўкі Украіне супрацьпяхотных мін. ААН паведаміла, што Кіеў выкарыстоўвае гэтыя боепрыпасы на полі бою).

Эстонія выходзіць з канвенцыі «ў знак рэгіянальнай салідарнасці», але выкарыстоўваць супрацьпяхотныя міны не плануе. «Вядома, Эстонія і нашы рэгіянальныя саюзнікі застаюцца адданымі захаванню міжнароднага гуманітарнага права і абароне грамадзянскага насельніцтва нават пасля выхаду з Атаўскай канвенцыі», — запэўніў міністр абароны рэспублікі Хана Пеўкур. У снежні 2024 года, калі гэту тэму абмяркоўвалі ў эстонскім парламенце, абароннае ведамства рэспублікі заявіла, што выходзіць з канвенцыі не трэба. Пеўкур назваў гэты від узбраенняў «састарэлым і дурным» і прапанаваў разглядзець альтэрнатыўныя сродкі — у прыватнасці, беспілотнікі і касетныя бомбы.

## ЯК ГЭТА РАШЭННЕ АЦАНІЛА МАСКВА

У Расіі заявілі, што рашэнне краін Балтыі і Польшчы «непазбежна прывядзе да далейшай эскалацыі напружанасці ў Еўропе і дэградацыі сітуацыі ў галіне рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі», і паабяцалі крокі ў адказ. «Краіны Захаду гатовыя адмовіцца ад міжнародна-прававых абавязацельстваў літаральна ў любую секунду, тады, калі ім уздумаецца, калі ім гэта выгадна і спатрэбіцца. Яны абсалютна не турбуюць сябе ў пошуку важкіх і адэкватных аргументаў для абгрунтавання такіх дзеянняў. Зрабілі заяву і «выйшлі», — адзначыла прадстаўнік МЗС Расіі Марыя Захарава.

Расія таксама выйшла з дамоўленасцяў, прадоўжыла яна, «але гэта былі крокі ў адказ на разбурэнне гэтых дамоўленасцяў або на выхад з іх іншых удзельнікаў». «Калі мы рабілі падобныя крокі, мы заўсёды іх аргументавалі, праводзячы спецыяльныя канферэнцыі, брыфінгі ці даючы поўнафарматныя тэкставыя тлумачэнні з лічбамі, датамі, фактамі і гэтак далей, — заявіла яна. — І ў першым, і ў другім выпадках мы заўсёды рабілі максімум для прадухілення падобнага развіцця падзей.

Мы прэвентыўна працавалі над захаваннем дамоўленасцяў. Толькі тады, калі яны разбураліся не намі, а іншымі ўдзельнікамі, мы аб'яўлялі пра ўласныя рашэнні».

Масква сцвярджае, што падзяляе мэты і задачы Атаўскай канвенцыі, але далучэнне да яе лічыць немэтазгодным. «Супрацьпяхотныя міны застаюцца эфектыўным і малазатратным сродкам забеспячэн-


**ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Мётча Агро»**

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 2103 | Капитальное строение с инвентарным номером 610/С-66468 (назначение – Здание административно-хозяйственное, наименование – Контора, общая площадь – 363,4 кв. м); Железобетонный забор, инв. № 3640; Котел RIZON-25, инв. № 44679 | Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, д. Старая Метча, ул. Светлая, 7Б | 28933,20 | 2893,32 | 1446,66 |
| 2106 | Многофункциональное устройство HP Laser | Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, д. Старая Метча, ул. Светлая, 7Б | 280,80 | 28,08 | 14,04 |
| 2107 | Стол компьютерный | | 85,32 | 8,53 | 4,27 |
| 2108 | Стол с приставкой 1350*1400*750 | | 140,40 | 14,04 | 7,02 |
| 2109 | Стул «Изо» | | 24,84 | 2,48 | 1,24 |
| 2110 | Шкаф 2-створчатый | | 83,16 | 8,32 | 4,16 |

В отношении лотов проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 20.06.2025

Лот № 2103 расположен на земельном участке с кадастровым номером 620884808601000276 площадью 0,1489 га, целевое назначение – для строительства и обслуживания конторы. Право аренды сроком по 19.01.2075. Ограничения (обременения): земельные участки, расположенные в охранных зонах электрической сети, код – 5,2, площадь – 0,0018 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах объектов газораспределительной системы, код – 5,7, площадь – 0,0086 га; земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах), код – 2,4, площадь – 0,1489 га

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **12 августа 2025 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 30 июля 2025 года до 16.00 8 августа 2025 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Метча Агро», проводимых 12.08.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лоту № 2103 – 7 %, по лотам №№ 2106–2010 – 10 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Нина Зигмундовна, тел. +375445504023 (пн – пт с 11.00 до 18.00).**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Мётча Агро» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. 80173958917, info@p-k.by (Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, д. Старая Метча, ул. Почтовая, д. 1, УНП 190564818)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

ня бяспекі працяглых расійскіх граніц», — так краіна матывавала сваю адмову ад удзелу ў пагадненні.

«Канвенцыя яшчэ пры яе распрацоўцы не вельмі падабалася расійскаму боку. Аргумент нашых ваеннаслужачых быў такі: нашы граніцы вельмі працяглыя, суседзі не заўсёды дружалюбныя, таму для таго, каб іх цалкам засцерагчы, акрамя нейкіх электронных сэнсараў, нам патрэбныя і супрацьпяхотныя міны, — растлумачыў вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага даследчага інстытута сусветнай эканомікі і міжнародных адносін імя Я. М. Прымакова Расійскай акадэміі навук Віктар Мізін. — Такую пазіцыю Расія захоўвае да гэтага часу з улікам таго, што выклікі яе бяспекі не слабеюць. У нашых балтыйскіх суседзяў логіка такая ж. Але я не думаю, што для Расіі гэта нейкая пагроза, бо ўпэўнены, што нападаць на гэтыя краіны яна не збіраецца, пра што было заяўлена на ўсіх аўтарытэтных узроўнях».





## ШТО КАЖУЦЬ У МІНСКУ?

Рэальнай прычынай выхаду Польшчы, Фінляндыі і краін Балтыі з Атаўскай канвенцыі аб забароне супрацьпяхотных мін з'яўляецца так званая пагроза з боку Саюзнай дзяржавы (СД) Расіі і Беларусі, якая ўнушаецца жыхарам гэтых краін. Такое меркаванне выказаў начальнік Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — намеснік міністра абароны Беларусі па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва Валерый Равенка.

«Якія ж рэальныя прычыны раптоўнага выхаду еўрапейскіх дзяржаў, што гранічаць з Расіяй і Беларуссю, з Атаўскай канвенцыі? Відавочна, што кіраўніцтву гэтых краін неабходна беспярэпынна пераконваць сваіх выбаршчыкаў у росце ўяўнай ваеннай пагрозы з боку Саюзнай дзяржавы. Прыходзіцца дэманстраваць крайнюю заклапочанасць нацыянальнай бяспекай і актыўнае супрацьдзеянне «пагрозе з Усходу», нястомна задавальняць апетыты ваеннай машыны, якія растуць ва ўрон іншым артыкулам расходаў бюджэту», — гаворыцца ў артыкуле Равенкі, апублікаваным у газеце Міністэрства абароны «Белорусская военная газета. Во славу Родины».

Паводле яго слоў, непазбежным стала і з'яўленне кола асоб, якія разлічваюць на хуткі прыбытак ад мілітарызацыі і лабіруюць паскоранае стварэнне ваенных вытворчасцяў. «Акрамя таго, узнікла добрая магчымасць запрасіць такое неабходнае дадатковае фінансаванне пад канкрэтныя «праекты» у Еўрапейскага саюза і НАТА. Імгненная выгада быццам бы ў наяўнасці», — указаў Равенка.

Пры гэтым ён прывёў меркаванне экспертаў, якія даказалі, што абараніць граніцы дзяржавы можна з дапамогай іншых сучасных сродкаў, якія не забаронены Атаўскай канвенцыяй і не наносяць грамадзянскаму насельніцтву шкоду нявыбарчага характару.

«Тым больш што па факце працягласць граніц НАТА на ўсходзе не вылічаецца дзясяткамі тысяч кіламетраў, а для іх узмацнення ўжо і так былі прыняты беспрэцэдэнтныя меры. Ці варта казаць, што гучнае папулісцкае рашэнне аб выхадзе з Атаўскай канвенцы быццам бы невялікай колькасці дзяржаў прывядзе да вельмі сур'ёзных гуманітарных наступстваў, а таксама стане чарговым трыгерам для разбурэння іншых міжнародных дамоўленасцяў у сферы раззбраення і кантролю над узбраеннямі?» — адзначыў начальнік дэпартамента.

Па меркаванні спецыялістаў, праблему ў гэтым пытанні ўяўляе і тое, што міны могуць заставацца ў месцах закладкі і пасля завяршэння канфлікту — нават дбайнае размінаванне тэрыторыі не гарантуе іх поўную нейтралізацыю, таму і ў мірны час на іх працягваюць падрывацца.

Па даных Landmine Monitor 2024 (*штогадовая справаздача, якая рыхтуецца экспертамі Міжнароднага руху за забарону супрацьпяхотных мін ICBL і Кааліцыі па касетных боепрыпасах CMC*), у 2023 годзе сама менш 5757 чалавек былі паранены і забіты мінамі, пакінутымі пасля войн; больш за ўсё ахвяр — 1003 — было зарэгістравана ў М'янме. 84 % пацярпелых прыпадае на грамадзянскае насельніцтва, з іх больш за трэць складаюць дзеці.

**Падрыхтаваў Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**

НА СЛЫХУ

# ПЕРАХАПІЛІ І АБЯСШКОДЗІЛІ

## У Мінску спынены палёт беспілотніка, начыненага тратылам і металічнымі шарыкамі

Як паведамілі ў Міністэрстве абароны, дзяжурнымі сіламі па супрацьпаветранай абароне ўначы 29 ліпеня ў паветранай прасторы быў выяўлены і спынены палёт неапазнанай паветранай цэлі — парушальніка парадку выкарыстання паветранай прасторы, ідэнтыфікаванага як БЛА. «У выніку ўздзеяння на яго сродкаў радыёэлектроннай барацьбы ў 2.33 БЛА ўпаў у раёне дома № 72 па вул. Матусевіча г. Мінска», — расказалі ў абаронным ведамстве.

У Мінабароны адзначылі, што з улікам гэтага інцыдэнту аператыўна прымаюцца дадатковыя меры па ўзмацненні кантролю за выкарыстаннем паветранай прасторы. Па дадзеным факце праводзіцца праверка. Кіраўнік дзяржавы трымае сітуацыю на асабістым кантролі.

Па факце падзення БЛА ў Мінску Следчым камітэтам расследуецца крымінальная справа. «Папярэдне ўстаноўлена, што ноччу 29 ліпеня беспілотны лятальны апарат, які быў знойдзены Міністэрствам абароны і прыгнечаны сродкамі радыёэлектроннай барацьбы, упаў без дэтанацыі, — адзначыў **афіцыйны прадстаўнік Следчага камітэта Сяргей КАБАКОВІЧ**. — Абломкі беспілотніка пашкодзілі некалькі прыпаркаваных аўтамабіляў і прызямліліся на прылеглую да дома тэрыторыю. У выніку інцыдэнту пацярпелых няма, эвакуацыя жыхароў не праводзілася».

На месцы здарэння працавала следча-аператыўная група. Следчым з прыцягненнем спецыялістаў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз і сапёраў праведзены агляд, зафіксавана следавая карціна. Канфіскаваны фрагменты корпуса і крылаў БЛА, рухавік, прыборы навігацыі і баявая частка, начыненая тратылам і вялікай колькасцю паражальных элементаў у выглядзе металічных шарыкаў. Следчым камітэтам ва ўзаемадзеянні з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі ўстанаўліваюцца ўсе акалічнасці здарэння.

У інтэрнэце з'явілася інфармацыя аб затрыманні асоб на месцы падзення беспілотніка. У ГУУС Мінгарвыканкама абверглі фэйк: «Абстаноўка ў Мінску застаецца спакойнай і кантраляванай. Супрацоўнікамі міліцыі праводзяцца аператыўна-вышуковыя мерапрыемствы для вызначэння асоб, якія распаўсюджваюць недакладную інфармацыю». Праваахоўнікі папярэджваюць, што за распаўсюджванне заведама лжывай інфармацыі прадугледжана крымінальная адказнасць.

**Вераніка КАНЮТА.**


Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015, г. Минск, ул. Пономаренко, 43 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Лоты №№ 1–21: Квартира, по адресу: г. Минск, ул. А. Купревича, 16**

| № лота | Инвентарный номер | Общ. пл., кв. м | № кв. | Начальная цена (без НДС), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | 500/D-7988236246 | 91,9 | 71 | 322 110,00 |
| 2. | 500/D-7988236248 | 81,1 | 75 | 284 220,00 |
| 3. | 500/D-7988236249 | 81,3 | 82 | 284 940,00 |
| 4. | 500/D-7988236250 | 91,9 | 85 | 322 110,00 |
| 5. | 500/D-7988236252 | 81,1 | 89 | 284 220,00 |
| 6. | 500/D-7988236253 | 91,8 | 92 | 321 750,00 |
| 7. | 500/D-7988237908 | 81,2 | 117 | 288 759,45 |
| 8. | 500/D-7988237910 | 81,5 | 124 | 291 186,00 |
| 9. | 500/D-7988237893 | 81,2 | 131 | 288 759,45 |
| 10. | 500/D-7988237872 | 49,1 | 147 | 186 617,87 |

**Лоты №№ 11–15: Машино-место, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16/1**
**Начальная цена лотов №№ 11–15: 18 156,00 бел. руб. с НДС 20 %**

**Задаток 1 %** от начальной цены лотов №№ 1–10, **5 %** от начальной цены лотов №№ 11–15 перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 3 (три) рабочих дня** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 6 (шесть) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **1 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в «Звязда» от 16.07.2025 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 11.08.2025 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.08.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**



**ДОПОЛНЕНИЕ К ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «РЕТОРСИЯ ТРЕЙД»,**
*опубликованной в газете «Звязда» от 17.05.2025 г.,*
по объекту
«Строительство жилого района с объектами инженерно-транспортной инфраструктуры в районе д. Тарасово Ждановичского с/с Минского района Минской области».
**Жилой дом № 1 по ГП.**

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, в жилом доме № 1 по генплану предлагаются:

**3 (три)** однокомнатные квартиры **площадью 34-35 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 303 до 5 503 белорусских рублей;**

**6 (шесть)** однокомнатных квартир **площадью 40-44 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 5 000 до 5 351 белорусского рубля;**

**5 (пять)** двухкомнатных квартир **площадью 62-64 кв. м,** стоимость 1 кв. метра **от 4 000 до 4 836 белорусских рублей.**

В организации действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося объекта.

Оплата производится в белорусских рублях. Указанные цены действуют до момента опубликования новой проектной декларации, дополнения или изменения к ней и при условии наличия квартир, предложенных для заключения по договорам создания объектов долевого строительства.

**Условия оплаты квартиры** – полная оплата цены договора в течение 3–7 рабочих дней либо поэтапная оплата цены договора в соответствии с действующей в организации системой рассрочки платежей с даты регистрации договора в местном исполнительном распорядительном органе.

Ознакомиться с планировками квартир можно по предварительной записи в офисе продаж «Гранд Вилладж» по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, д. 19, пом. 1567 по графику: пн-пт с 9.00 до 18.00, сб, вс – выходной либо на сайте grand-village.by.

Тел. офиса продаж +375 (29) 177-00-22.

Приём заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться в порядке живой очереди с 9.00 31.07.2025 г.

УНП 691310944

# СКАНВОРД

Чый ..., таго і рыба (прык.)
Трэці дзень тыдня
Гара ў паўночнай Фесаліі
Кругі вакол Сонца
Малодшая сястрычка ігуаны
Орган кіравання войскам
Жыхар Егіпта
Пакатая паверхня
Вулканічная маса
Бог кахання
Тое, што і біяполе
Старая жанчына
Прэсаводная рыба
Фізічная сіла
Хлеб - усяму ... (прык.)
Ядавітае рэчыва
...- ляп
Водступ у пачатку радка
Нагустая страва з бураку
...- два і гатова
Плямістая «кошка»
Вучнёўскі стол
Насавая частка палубы
Чырвоны каштоўны камень
Ільдзіна на рацэ
Захворванне міндалін
Вострыя соус з соі
Бавоўна ў аптэцы
Сямейны саюз
Імя пісьменніка Міцкевіча
Парусное, тырысцкае судна
Дзіцячая сабакі
Разрыўны снарад
Верхняя частка дома



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Яшчар. Бераг. Лава. Нахіл. Баба. Моц. Карп. Ягуар. Парта. Абзац. Кабул. Крыга. Вата. Шакал. Шчаня. Дах. Бомба. **Па вертыкалі:** Серада. Штаб. Араб. Алімп. Гало. Амур. Аўра. Цяп. Раз. Галава. Атрута. Боршч. Ангіна. Бак. Лал. Шлюб. Адам. Яхта.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| МІНСК | 758 мм рт.сл. | +15..+16°С / +19..+21°С |
| ВІЦЕБСК | 757 мм рт.сл. | +18..+20°С / +18..+19°С |
| МАГІЛЁЎ | 758 мм рт.сл. | +16..+18°С / +17..+18°С |
| ГОМЕЛЬ | 758 мм рт.сл. | +14..+17°С / +19..+21°С |
| ГРОДНА | 759 мм рт.сл. | +12..+15°С / +22..+24°С |
| БРЭСТ | 759 мм рт.сл. | +12..+15°С / +22..+23°С |

**Месяц**

*Маладзік 24.07.–31.07. Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

Паводле даных Белгідрамета

**...у суседзяў**

МАСКВА +28..+29°С
С.-ПЕЦЯРБУРГ +29..+30°С



Фота Лізаветы ГОЛАД.

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

## КАЛІ БАГАТЫЯ ПЛАЧУЦЬ

**Гэта гісторыя хутчэй балючая, чым вясёлая, але ж мама і яе браты, а мае, значыць, родныя дзядзькі, успаміналі яе з гумарам.**

Калі па парадку, то час тады быў цяжкі, пасляваенны: у вёсках (ды і гарадах) панавала галеча. Чацвёра дзяцей у бабулі (мамінай мамы, бацька памёр да вайны) — жылі на падножным корме, як той казаў. Худыя, бледнатварыя, заўжды паўгалодныя... Дарослыя таксама не лепшыя: хіба зрэдку на вочы мог трапіцца чалавек «у целе». Яго ў вёсцы звалі «жырным», бо ён жа і сапраўды жыруе, мае што есці. А калі так, то ён вельмі багаты!

Высնова, згадзіцеся, досыць лагічная для таго няпростага часу. Дык вось, неяк раз бабулі пашчасціла раздабыць трошкі тлушчу. Несучы яго дадому, гаспадыня прыкідвала, што ім можна будзе хоць суп запраўіць, хоць распусціць на патэльні, а дзеці потым пасядуць вакол і змогуць памачаць у яго бульбінай ці праснаком з дамешкам травы. Ну ці ж не смаката?

Радавалася матуля, а дзеці ўжо як...

— Мы цяпер «жырныя»? — пыталіся яны.

— Ну, вядома ж, — адказвала маці.

Гэтай дабрэннай навіной («жырныя» — значыць, багатыя!) малым трэба было пахваліцца перад сябрамі ды іншымі аднавяскоўцамі — прычым тэрмінова. Надоўга думаючы, яны, усе чацвёра, намазаліся тлушчам і панесліся па вуліцы ад двара да двара. Праўда, надоўга яны так бегалі, надоўга фарсілі...

Атрымалі пасля на арэхі і разам з матуляй пашкадавалі, што амаль увесь тлушч, які мог хоць крыху падтрымаць іх падчас поўнай нішчымніцы, пайшоў «у свісток» — на тое, каб пахваліцца перад іншымі, як «жырна» яны зажылі.

**Ала АЛЬФЕР,**
г. Беразіно.

## КАНДРАТ І ЯГО ЖОНКІ

**Мая бабуля Лукер'я Усцінаўна расказвала гэта, як расказваюць казкі, але ж кожны раз не забывалася падкрэсліць, што ўсё тут — чыстая праўда.**

Значыць, у іхняй вёсцы жыў калісьці мужык па імені Кандрат, і была ў яго жонка Агапка, а вось дзяцей, на жаль, не было. І таму вырашыў гэты мужчына ажаніцца яшчэ раз. Прычым не сам да некага ў прымы пайшоў, — прывёў малодку дадому. Убачыўшы гэта, Агапка, старая жонка, дужа схацела некуды сысці. І яна сышла б, каб было куды. А так засталася жыць, дзе жыла, толькі ўжо па-іншаму: новая жонка спаць кладзецца з Кандратам, у зале, Агапка — у каморцы, на печы; новая спіць да паўдня, а старая на досвітку ўстае, гаспадарку пыніць...

Узялася неяк у печы паліць, ежу гатаваць — бачыць, што дроў скупавата. І гаспадар на касьбу сышоў. Што было рабіць гаспадыні? Пабудзіла, падняла маладуху — удзвюх з ёй сталі дровы пілаваць.

Нялёгкая гэта работа — замарыліся бабы, але ж Агапка той малодцы сякеру падае.

— А зараз, — кажа, — будзем з табою калоць.

— Яшчэ чаго! — абураецца новая Кандратава жонка. — У нашай хаце што, мужчыны няма?! Ёсць! Дык хай ён і сячэ! Я — нават не збіраюся... А на тваім месцы, — кажа Агапцы, — я б яму... галаву адсекла!

Ляпнула так, бо не бачыла, што Кандрат паблізу стаіць і ўсё гэта чуе. А потым як закрычыць:

— Агапка, запрагай кабылу, грузі на воз усе транты во гэтай сцервы! І каб духу яе тут больш не было!

З'ехала маладуха, а Кандрат і надалей застаўся жыць са сваёю Агапкай.

**Міхась СЛІВА,**
г. Рагачоў.

## 30 ЛІПЕНЯ — Даты — Падзеі — Людзі

У краіне

**1870** год — нарадзіўся Канстанцін Васільевіч Харламповіч (в. Рагачы Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.), беларускі гісторык царквы, педагог, член-карэспандэнт Петраградскай АН (1916 г.). Выкладаў у Казанскай духоўнай семінарыі, з 1899 г. — прыват-дацэнт, у 1909 — 1921 гг. — прафесар Казанскага ўніверсітэта. Даследаваў гісторыю праваслаўнай царквы і адукацыі ў Беларусі, Расіі і Украіне ў XVI-XVII стст., становішча беларускага і ўкраінскага народаў у Рэчы Паспалітай, узаемасувязі ўсходнеславянскіх літаратур.

**1940** год — нарадзіўся Аляксей Уладзіміравіч Ніканчыкаў (Расія), беларускі спартсмен (фехтаванне на шпагах), заслужаны майстар спорту СССР (1966 г.), заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі (1971 год). Сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў (1968 г.) у камандным заліку. Чэмпіён свету ў асабістым (1966, 1967, 1970 гг.) і камандным (1967, 1970 гг.) заліках. Сярэбраны (1966, 1971 гг.) і бронзавы (1962, 1965 гг.) прызёр чэмпіянату свету ў камандным, сярэбраны (1969 г.) — у асабістым заліках.

У свеце

**1830** год — нарадзіўся Генадзь Данілавіч Раманоўскі, рускі геолаг і горны інжынер. Правёў шырокія даследаванні радовішчаў карысных выкапняў на тэрыторыі Еўрапейскай часткі Расіі, Урала і Сярэдняй Азіі. Вывучаў вугальныя радовішчы Падмаскоўнага басейна і ўсходніх схілаў Урала, нафтаноснасць раёна Кубані, даў прагноз аб нафтаноснасці Ферганы. Быў буйным спецыялістам па тэхніцы свідравання; прапанаваў шраг удасканаленняў у гэтай галіне. Кіраваў глыбокім бурэннем на падземныя воды паблізу Пецярбурга і ў Крыме.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні міністру юстыцыі Рэспублікі Беларусь Яўгену Іосіфавічу КАВАЛЕНКУ ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 779 Індэкс 63850. Зак. № 1525.

Нумар падпісаны ў 19.30 29 ліпеня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12